Пасведчанне аб рэгістрацыі № 671 ад 18 верасня 2009 г.
ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНЫ І ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

# ВЕСНІК АДУКАЦЫІ

ВЫДАЕЦЦА СА СТУДЗЕНЯ 2003 ГОДА

4

2019

## ВЕСТНИК ОБРАЗОВАНИЯ

ЕЖЕМЕСЯЧНЫЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКИЙ И ИНФОРМАЦИОННО-МЕТОДИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ

**Заснавальнік і выдавец**
**Навукова-метадычная ўстанова**
**«Нацыянальны інстытут адукацыі»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**
В.В.ГІНЧУК – **галоўны рэдактар,** кандыдат педагагічных навук
Г.М.ПРАСАЛОВІЧ – намеснік галоўнага рэдактара
А.А.ГЛІНСКІ, кандыдат педагагічных навук
В.У.ЗЕЛЯНКО, доктар педагагічных навук
Н.К.КАТОВІЧ, кандыдат педагагічных навук
Т.В.ЛІСОЎСКАЯ, доктар педагагічных навук
В.Ф.РУСЕЦКІ, доктар педагагічных навук
В.І.ЦІРЫНАВА, кандыдат педагагічных навук
І.Л.ШАЎЛЯКОВА-БАРЗЕНКА, кандыдат філалагічных навук
М.Б.ШПІЛЕЎСКАЯ, рэдактар аддзела

**РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ**
М.Г.ЯЛЕНСКІ – **старшыня,** доктар педагагічных навук
С.А.ВАЖНІК, кандыдат філалагічных навук
Г.М.ВАЛОЧКА, доктар педагагічных навук
А.С.ЛАПЦЁНАК, доктар філасофскіх навук
А.А.ЛУКАШАНЕЦ, доктар філалагічных навук
М.А.МАЖЭЙКА, доктар філасофскіх навук
А.П.МАНАСТЫРНЫ, кандыдат фізіка-матэматычных навук
Г.У.ПАЛЬЧЫК, доктар педагагічных навук
Д.Г.РОТМАН, доктар сацыялагічных навук
В.А.САЛЕЕЎ, доктар філасофскіх навук
Р.С.СІДАРЭНКА, кандыдат педагагічных навук

Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў

Нумар падрыхтавалі:

**Камп’ютарная вёрстка**
Л.Залужная

**Дызайн-макет**
Л.Залужная

**Рэдактары**
В.Паніна
М.Шпілеўская

**Карэктар**
С.Сысоева

**Камп’ютарны набор**
І.Мазурэнка

Думкі, выказаныя ў матэрыялах часопіса, не заўсёды супадаюць з пунктам гледжання рэдакцыі.
Адказнасць за дакладнасць інфармацыі, змешчанай у артыкулах, нясуць аўтары.
Пераносы некаторых слоў зроблены не па правілах граматыкі, а паводле магчымасцей камп’ютара.

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Караля, 16,
г. Мінск, 220004
Тэл.: (017) 200 54 09
факс: (017) 200 56 35
**red.pednauka@gmail.com**

Падпісана ў друк 19.04.2019
Фармат 60х84 1/8
Ум. друк. арк. 7,44
Ул.-выд. арк. 7,12
Тыраж 467 экз.
Заказ № 0389

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Прамдрук».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/21 ад 29.11.2013.
Вул. Чарняхоўскага, 3, 220049, Мінск.

## У НУМАРЫ

**НАВУКОВЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ**

3 ***Валочка Г. М.***
Асобасныя і метапрадметныя вынікі навучання беларускай мове

**У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКУ**

9 ***Кречик В. М.***
Виды рефлексии на уроках иностранного языка

14 ***Саланкова Г. М.***
Вывучэнне тэмы «Скланенне і правапіс лічэбнікаў» у X класе

18 ***Яблонская Ю. К.***
Урок химии в VIII классе по теме «Химические свойства кислот»

23 ***Ковалевская Н. Г.***
Урок искусства в V классе по теме «Образ животного в искусстве (музыка)»

**СКАРБОНКА ПЕДАГАГІЧНАГА ВОПЫТУ**

27 ***Аршанский Е. Я., Сусед-Виличинская Ю. С.***
«Менделеевские среды»: история и современный ренессанс

**2019 — ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ**

33 ***Праскаловіч В. У., Грынько С. Д.***
Развіццё цікавасці навучэнцаў да малой радзімы пісьменніка сродкамі музея

40 ***Станоўская Ж. Г.***
Беларускія пасядзелкі «Хата ўцехамі багата»

**ДАТА**

44 ***Кадол Ф. В.***
К. Д. Ушинский о личности учителя и системе его подготовки (К 195-летию выдающегося педагога)

**9 МАЯ — ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ**

49 ***Митько В. В.***
А были вместе — детство и война... (Литературно-музыкальная композиция для учащихся III—VIII классов)

55 ***Каменский Ю. П., Малышко С. Ю.***
Литературно-историческая викторина «Войны священные страницы» (X, XI классы)

**ДАДАТКОВАЯ АДУКАЦЫЯ**

60 ***Макушкин О. В.***
Педагогический консорциум как инновационная форма системного взаимодействия профильных лагерей

**ІНФАРМАЦЫЯ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ**

63 ***Валочка Г. М.***
Каштоўнае лексікаграфічнае выданне

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019

# Асобасныя і метапрадметныя вынікі навучання беларускай мове

**Г. М. Валочка,**
галоўны навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі,
доктар педагагічных навук, прафесар,
прафесар Цяньцзінскага ўніверсітэта замежных моў (КНР)

Апошнім часам на ўсіх узроўнях нацыянальнай сістэмы адукацыі ўкараняецца кампетэнтнасны падыход, які акцэнтуе ўвагу на фарміраванні ў навучэнцаў здольнасці выкарыстоўваць атрыманыя веды і сфарміраваныя ўменні ў новых і нестандартных жыццёвых сітуацыях, што дазваляе пераадолець разрыў паміж ведамі навучэнцаў і практычнай дзейнасцю. У кантэксце кампетэнтнаснага падыходу працэс навучання і выхавання ва ўстанове адукацыі павінен арыентавацца на дасягненне жыццёвых вынікаў (кампетэнцый), якія разумеюцца не толькі як прадметныя вынікі адукацыі, але і як метапрадметныя і асобасныя.

Новыя адукацыйныя стандарты агульнай базавай і сярэдняй адукацыі (зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 26.12.2018 № 125) арыентуюць не на традыцыйны падыход («праверыць, што і як з пералічаных элементаў асвоена навучэнцамі»), а на новую парадыгму: ацаніць, наколькі свабодна вучні могуць выкарыстоўваць атрыманыя веды і спосабы дзейнасці для вырашэння разнастайных вучэбных і жыццёвых задач. У сучасных стандартах патрабаванні да вынікаў асваення навучэнцамі адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі падзяляюцца на асобасныя, метапрадметныя і прадметныя.

Асобасныя вынікі асваення адукацыйнай праграмы базавай і сярэдняй адукацыі перадаюць асаблівасці развіцця асобы вучня і ўключаюць сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў і сацыяльна-асобасных якасцей, якія дазваляюць чалавеку самаразвівацца, ставіць мэты і планаваць жыццё, займаць актыўную жыццёвую пазіцыю, захоўваць псіхічнае і фізічнае здароўе, нацыянальную ідэнтычнасць у полікультурным соцыуме.

Метапрадметныя вынікі асваення адукацыйнай праграмы базавай і сярэдняй адукацыі ўключаюць сукупнасць універсальных (агульнавучэбных, міждысцыплінарных, надпрадметных) вучэбных дзеянняў (пазнавальных, камунікатыўных, рэгулятыўных), якія асвойваюцца на базе аднаго, некалькіх або ўсіх вучэбных прадметаў і выкарыстоўваюцца як у рамках адукацыйнага працэсу, так і пры рашэнні праблем у рэальных жыццёвых сітуацыях [1; 2]. Валоданне метапрадметнымі кампетэнцыямі дазваляе чалавеку самастойна здабываць веды, арганізоўваць вучэбнае супрацоўніцтва, вырашаць агульныя для розных відаў прафесійнай і іншай дзейнасці праблемы (камунікацыі, пошуку і аналізу інфармацыі, прыняцця рашэнняў, арганізацыі сумеснай дзейнасці і г. д.), працягваць адукацыю ўсё жыццё.

Вучэбны прадмет «Беларуская мова» займае адно з істотных месцаў сярод іншых прадметаў гуманітарнай адукацыі, бо з'яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам навучання іншым

дысцыплінам (ва ўстановах з беларускай мовай навучання), далучэння да каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культур, нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі. Навучанне мове садзейнічае засваенню ведаў, норм і каштоўнасцей, якія рэгулююць узаемадзеянне асобы і соцыуму, і, як вынік, стварае ўмовы для сацыялізацыі вучняў, актыўнага ўключэння ў розныя сферы дзейнасці сучаснага грамадства (адукацыйную, культурную, эканамічную, палітычную і інш.).

Разам з фарміраваннем сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культур вучняў вывучэнне мовы спрыяе таксама асэнсаванню навучэнцамі эстэтычнай функцыі мовы, развіццю здольнасці ацэньваць эстэтычную каштоўнасць мастацкага тэксту, раскрываць ролю ўжытых у ім вобразна-выяўленчых моўных сродкаў, фарміраванню патрэбы ўдасканальваць уласнае маўленне. Аб'ектам увагі пры навучанні мове становіцца ўзорны мастацкі тэкст, паколькі менавіта ў ім найбольш ярка адлюстроўваецца эстэтычная каштоўнасць мовы. Эстэтычныя адносіны вучняў да мовы фарміруюцца праз усведамленне багацця моўных сродкаў, іх экспрэсіўнасці, выразнасці, мілагучнасці, дарэчнасці ўжывання ў тэкстах розных стыляў.

У працэсе рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Беларуская мова» асаблівай увагі патрабуе актуалізацыя анталагічнага аспекту навучання і выхавання.

*Анталагічны аспект навучання і выхавання* фарміруе перш за ўсё чалавечыя адносіны да быцця і быційную сістэму каштоўнасных уяўленняў (пра прыгажосць, дабро, справядлівасць і інш.), у адпаведнасці з якой гэтыя адносіны развіваюцца. Інакш кажучы, у працэсе анталагічнага навучання і выхавання адбываецца фарміраванне ў навучэнцаў уяўленняў пра быццё сапраўдных каштоўнасцей, якія выступаюць асновай мэтавызначэння і ацэначнай дзейнасці чалавека і дазваляюць яму весці творчае і гарманічнае жыццё.

З пункту погляду быційнай прыроды чалавека выдзяляюцца тры аспекты выхавання: *сацыяльна-нарматыўны* (фарміраванне асобы праз ідэнтыфікацыю з сацыякультурным і прафесійным асяроддзем: у першую чаргу прыняцце яго норм), *індывідуальна-сэнсавы* (развіццё індывідуальнасці як вылучэнне сябе з асяроддзя: самавызначэнне, самастанаўленне, самарэалізацыя ... і іншыя «са́ма», якія вызначаюць самакаштоўнасць чалавека ў жыцці і дзейнасці), і *каштоўнасна-дзейнасны* (станаўленне суб'ектнасці ва ўзаемадзеянні з асяроддзем: абмен уплывамі, не толькі прыняцце каштоўнасцей асяроддзя, але і сцвярджэнне ў ім сваіх поглядаў, свайго значэння) [3].

Анталагічнае разуменне выхавання, такім чынам, заключаецца ў наступным:

- выхаваўчы працэс – гэта працэс фарміравання і росту суб'ектнасці чалавека – самавызначэння і самасцвярджэння яго ў сацыякультурным і прафесійным асяроддзі;
- у аснове механізму выхавання — каштоўнасна-сэнсавая сутрансфармацыя суб'ектаў выхаваўчага працэсу (педагога і выхаванца) у адзінай сэнсавай прасторы ўзаемадзеяння;
- сітуацыя выхавання мае дыялагічны характар, калі знешняе ўзаемадзеянне з'яўляецца ўмовай і перадумовай станаўлення ўнутранага свету кожнага з яго суб'ектаў [3].

Аснову анталагічна арыентаванага зместу выхавання складаюць філасофска-антрапалагічныя паняцці, «зместава-дзейнасныя "вузлы" быцця чалавека, цэлыя тэмы, прыярытэтныя лініі разважанняў, сузіранняў, матываў, учынкаў» [4, с. 149]. Гэта такія катэгорыі быцця, як «чалавек», «жыццё», «індывід», «індывідуальнасць», «сэнс, мэта жыцця», «каштоўнасць», «душа», «дух, духоўнасць», «вера», «надзея», «любоў», «цярпімасць», «суперажыванне», «разуменне», «свабода», «давер», «выбар» і інш.

Сэнс дзейнасці педагога – «абапірацца на этыку, уключаную ў анталогію» [5, с. 365], што прадугледжвае накіраванасць адукацыйнага працэсу на прысваенне вуч-

нямі духоўна-маральных каштоўнасцей, на дыялог, палілог, разуменне і паразуменне суб'ектаў выхаваўчага працэсу.

*Анталагічны аспект навучання і выхавання* прадугледжвае мэтанакіраванае ўзаемадзеянне педагога з вучнямі для выяўлення ўсеагульных заканамернасцей, каштоўнасных асноў быцця чалавека (суб'екта), яго практычнай дзейнасці і паводзін.

Накіраванасць вучэбнага прадмета «Беларуская мова» на дасягненне асобасных вынікаў *у анталагічным аспекце* перш за ўсё звязана з рэалізацыяй у навучанні *лінгвакультуралагічнага напрамку* (усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры) і *сацыякультурнага напрамку* (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных і агульначалавечых каштоўнасцей беларускага народа, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве) [6].

Спасціжэнне вучнямі каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін мэтазгодна рэалізоўваць у навучанні беларускай мове праз разнастайныя віды заданняў, звязаных з вывучэннем:

- *сімвалаў нацыянальнай культуры* (раскрыццё сімвалічнага сэнсу паняццяў культуры, дапаўненне сказаў культуразнаўчай інфармацыяй, аналіз культуразнаўчых тэкстаў);
- *афарыстычных выказванняў* (тлумачэнне сэнсу афарыстычных выказванняў, стварэнне вучнямі ўласных вусных і пісьмовых выказванняў на прапанаваную тэму);
- *культуразнаўчых тэкстаў* (раскрыццё значэння ўжытых у тэксце нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, аналіз змешчанай у тэксце культуразнаўчай інфармацыі, выказванні вучняў па аналогіі з прыведзенымі ў тэксце культуразнаўчымі звесткамі);
- *беларускай безэквівалентнай (у адносінах да рускай мовы) лексікі* (падбор да прапанаваных слоў беларускай мовы рускамоўных адпаведнікаў, утварэнне безэквівалентных слоў пэўнай словаўтваральнай мадэлі па ўзоры);
- *іншамоўных лексем* (вызначэнне міжмоўных амонімаў і паронімаў па прыведзеных лексічных значэннях, падбор беларускіх адпаведнікаў да фразеалагізмаў, прыказак рускай мовы);
- *норм маўленчых паводзін (у тым ліку сацыяльных)* (падбор беларускіх адпаведнікаў да рускамоўных этыкетных формул; устанаўленне адпаведнасці паміж ветлівымі пажаданнямі і іх адрасатам; аналіз тэкстаў, у якіх паведамляецца пра спецыфіку маўленчых паводзін прадстаўнікоў іншых культур; мадэляванне маўленчых сітуацый, якія адпавядаюць прынятым у грамадстве правілам паводзін) [7].

Пры *ацэньванні асобасных вынікаў* асваення вучнямі адукацыйных праграм звяртаецца ўвага на:

1) сфарміраванасць асноў грамадзянскай ідэнтычнасці асобы;
2) сфарміраванасць сацыяльных кампетэнцый, у тым ліку каштоўнасна-сэнсавых установак і маральных норм, вопыту сацыяльных і міжасобасных адносін, правасвядомасці.

Пры гэтым лічыцца, што дасягненне асобасных вынікаў не павінна ўплываць на адзнаку па прадмеце, а з'яўляецца прадметам ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці ўстановы адукацыі і адукацыйных сістэм рознага ўзроўню.

*Метапрадметныя вынікі* ўключаюць наступныя ўніверсальныя вучэбныя дзеянні:

- *рэгулятыўныя* (кіраванне сваёй дзейнасцю; кантроль і карэкцыя; ініцыятыўнасць і самастойнасць і інш.);
- *камунікатыўныя* (маўленчая дзейнасць; уменні супрацоўніцтва і інш.);

- *пазнавальныя* (праца з інфармацыяй; выкананне лагічных аперацый параўнання, аналізу, абагульнення, класіфікацыі, устанаўлення аналогій і інш.).

Сярод патрабаванняў, што прад'яўляюцца да ўзроўню моўнай падрыхтоўкі выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, абавязковымі з'яўляюцца ўменні:

- адэкватна ўспрымаць вуснае маўленне, перадаваць змест пачутага ў адпаведнасці з навучальнымі задачамі;
- чытаць тэксты розных тыпаў, стыляў і жанраў з выкарыстаннем розных відаў чытання (азнаямляльнае, праглядавае, пошукавае, вывучальнае); аналізаваць структуру і моўныя асаблівасці тэксту; вызначаць тэму, асноўную думку, стыль тэксту;
- валодаць маналагічным і дыялагічным маўленнем; уступаць у маўленчыя зносіны, удзельнічаць у дыялогу, захоўваючы нормы і правілы маўленчага этыкету (разумець пазіцыю суразмоўцы, прызнаваць яго права на ўласную думку і г. д.);
- ствараць пісьмовыя тэксты (выказванні) у адпаведнасці з вучэбнымі задачамі, перадаваць змест праслуханага ці прачытанага падрабязна, сцісла або выбарачна (рабіць падрабязны, сціслы і выбарачны пераказ тэксту); адэкватна выказваць сваё стаўленне да фактаў і з'яў навакольнай рэчаіснасці, да прачытанага, пачутага, убачанага; складаць планы, тэзісы, канспекты; прыводзіць прыклады, аргументы, фармуляваць вывады; умець перафразіраваць выказванне (перадаваць думку іншымі словамі);
- выбіраць і выкарыстоўваць моўныя сродкі (у тым ліку і вобразна-выяўленчыя) у адпаведнасці з камунікатыўнай задачай, сферай і сітуацыяй зносін;
- выкарыстоўваць для рашэння пазнавальных і камунікатыўных задач розныя сродкі інфармацыі (энцыклапедыі, слоўнікі, інтэрнэт-рэсурсы і інш.).

Названыя ўменні з'яўляюцца ўніверсальнымі, метапрадметнымі. Яны перш за ўсё фарміруюцца на ўроках беларускай і рускай мовы і літаратуры. На ўроках мовы закладваюцца асновы працы з тэкстам: у вучняў фарміруецца ўяўленне пра тэкст як адзінку звязнага маўлення, разглядаюцца прыметы тэксту, асэнсоўваюцца значэнне, будова і моўныя асаблівасці тэкстаў-апавяданняў, тэкстаў-апісанняў і тэкстаў-разважанняў, вывучаецца жанравая і стылістычная разнастайнасць тэкстаў. У працэсе навучання беларускай і рускай мовам навучэнцы вучацца працаваць з тэкстам і інфармацыяй, выкладзенай у ім: вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, дзяліць тэкст на часткі і складаць план, даваць тэксту загаловак, выпісваць ключавыя словы і сказы; пераказваць тэксты, ствараць самастойныя выказванні рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці ў вуснай і пісьмовай формах.

Нягледзячы на тое, што агульныя, універсальныя ўменні працы з тэкстам фарміруюцца пры вывучэнні розных вучэбных прадметаў, беларускай (і рускай) мове і літаратуры ў гэтым плане належыць галоўная роля.

Сярод універсальных деянняў можна выдзеліць агульнавучэбныя дзеянні, якія звязаны з чытаннем і разуменнем тэкстаў, іх пераўтварэннем, а таксама з выкарыстаннем інфармацыі з тэкстаў з разнастайнымі мэтамі. Найбольш істотнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца сэнсавае чытанне і лагічныя дзеянні, накіраваныя на аналіз, абагульненне, устанаўленне аналогіі, прычынна-выніковых сувязей, класіфікацыю, разважанні, суджэнні і фармуляванне вывадаў на аснове прачытанага тэксту.

Прыярытэтнай задачай сучаснай адукацыі становіцца фарміраванне ў навучэнцаў *функцыянальнай пісьменнасці* [8] і чытацкай пісьменнасці ў прыватнасці, што вызначаюцца выразнай метапрадметнай скіраванасцю.

З мэтай развіцця функцыянальнай пісьменнасці вучняў і навыкаў функцыянальнага чытання на ўроках беларускай мовы неабходна фарміраваць (развіваць,

удасканальваць) наступныя ўменні і навыкі:

- працаваць з рознымі інфармацыйнымі крыніцамі (графікі, схемы, дыяграмы, інструкцыі і інш.);
- аналізаваць, сінтэзаваць, абагульняць і сістэматызаваць змест тэксту;
- даваць ацэнку выкладзенай у тэксце (тэкстах) інфармацыі.

Ацэньваючы ўзровень чытацкай пісьменнасці вучняў, неабходна звярнуць увагу на сфарміраванасць у іх наступных уменняў:

- знайсці і выбраць (інфармацыю);
- інтэграваць і інтэрпрэтаваць (паведамленне тэксту);
- асэнсаваць і ацаніць (змест тэксту і форму тэксту) [9].

Заданні, накіраваныя на атрыманне ў працэсе навучання беларускай мове метапрадметных вынікаў (у анталагічным аспекце), перш за ўсё прадугледжваюць працу з тэкстам: пошук інфармацыі і разуменне прачытанага, пераўтварэнне і інтэрпрэтацыю інфармацыі, яе ацэнку.

Прывядзём прыклады заданняў, звязаных з ацэнкай сфарміраванасці ў навучэнцаў уменняў і навыкаў працы з тэкстам [10]:

*I. Прагляд тэксту і пошук (выяўленне) інфармацыі.*

Які спосаб прапаноўваецца ў тэксце для таго, каб навучыцца спраўляцца з уласнымі крыўдамі?

Прывядзіце прыклады з тэксту, у якіх выказана патрабаванне да размяшчэння ПЭВМ.

Знайдзіце ў тэксце інфармацыю, якая пацвярджае, што самым значным вынаходствам за ўсю гісторыю чалавецтва з'яўляецца кніга.

*II. Разуменне інфармацыі.*

Што аўтар меў на ўвазе, калі пісаў пра дуб як вельмі складаны і багаты па змесце сімвал?

Чаму герой не можа знайсці адказу на пастаўленае ў загалоўку пытанне? Абгрунтуйце сваё меркаванне, выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту.

Якімі прыкладамі з тэксту можна пацвердзіць наступнае выказванне: «І сёння, нягледзячы на з'яўленне і развіццё электронных сродкаў камунікацыі, кніга не страціла свайго першаступеннага значэння»?

*III. Ацэнка і рэфлексія.*

Хто з удзельнікаў даў найбольш правільны адказ? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

Як вы думаеце, чаму нельга цалкам давяраць інфармацыі, якая прыводзіцца ў інтэрнэце?

Ці з'яўляецца прапанаваны тэкст прыкладам аб'ектыўнай інфармацыі?

З якой мэтай у артыкуле прыводзяцца водгукі ўдзельнікаў падзей?

Ці згодныя вы з тым, што кніга застаецца самым надзейным і стабільным носьбітам і захавальнікам інфармацыі?

Вы прачыталі два выказванні пра спектакль (кнігу, кінафільм). З думкай каго вы згодны? Абгрунтуйце свой адказ.

Моўная адукацыя мае на мэце не проста навучыць правільна, у адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі, пісаць словы, дакладна ставіць знакі прыпынку ў сказах рознай будовы, але і прывіць вучню любоў да роднай мовы як нацыянальнага набытку і як сродку, які забяспечвае працэс развіцця і сацыялізацыі. Таму на ўроку беларускай мовы значная роля надаецца мастацкаму тэксту, які, валодаючы велізарнай сілай уздзеяння, спрыяе фарміраванню духоўна-маральных якасцей асобы, уяўленняў пра дабро і зло, месца і ролю чалавека ў навакольным свеце.

Менавіта гэта вымагае скрупулёзнага адбору тэкставага матэрыялу да кожнага ўрока, змест якога накіраваны на фарміраванне грамадзянскасці, асобасных якасцей вучняў. Дыдактычны матэрыял павінен звяртаць увагу вучняў на сучасныя дасягненні, на новыя адкрыцці ў навуцы і тэхніцы, на факты жыцця выдатных людзей, на працэсы выхавання волі, працавітасці, на высокія маральныя якасці чалавека.

Рэалізацыя анталагічнага аспекту асобасных і метапрадметных вынікаў у працэсе навучання беларускай мове можа адбывацца праз:

1) прывіццё любові да роднай мовы, павагі да яе;

2) выкарыстанне культуразнаўчых тэкстаў, на аснове зместу якіх адбываецца не толькі выпрацоўка моўных і камунікатыўных уменняў і навыкаў, але і асэнсаванне вучнямі культурнага вопыту народа (нацыянальных звычаяў і традыцый, духоўна-маральных каштоўнасцей, дасягненняў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і г. д.);
3) самавыражэнне саміх вучняў у працэсе стварэння імі ўласных выказванняў у вуснай і пісьмовай формах. У працы над уласным маўленчым творам, вусным або пісьмовым, актуалізуюцца ўсе веды і ўменні, назапашаныя ў працэсе вывучэння мовы. У гэтым сэнсе вялікія магчымасці маюць разнастайныя конкурсы, алімпіяды, даследаванні ўласных назваў, дыялектаў, выданні газет і школьных часопісаў, работа гурткоў беларускай мовы, падрыхтоўка радыё- і тэлеперадач, дзейнасць школьнага тэатра і г. д.;
4) развіццё культуры маўлення вучня (праз змест і афармленне яго выказвання, захаванне літаратурных норм, бо, як вядома, валоданне нормамі літаратурнай мовы з’яўляецца асноўным паказчыкам культуры маўлення, а таксама агульнай культуры чалавека).

Такім чынам, дасягненне асобасных і метапрадметных вынікаў (у анталагічным аспекце) асваення вучнямі вучэбнага прадмета «Беларуская мова» садзейнічае павышэнню яго выхаваўчага патэнцыялу; сацыяльнай актыўнасці і вучэбнай матывацыі навучэнцаў, паляпшэнню якасці адукацыі. Фарміраванне ў працэсе навучання не толькі сістэмы тэарэтычных ведаў і ўменняў, але і якасцей асобы будзе спрыяць развіццю інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу навучэнцаў, захаванню і памнажэнню культурнай спадчыны, забеспячэнню гарманічнага развіцця міжнацыянальных і міжканфесійных адносін у Рэспубліцы Беларусь.


1. *Николаева, А. Д.* Метапредметные компетенции как педагогическая категория [Электронный ресурс] / А. Д. Николаева, О. И. Маркова // Современные проблемы. — 2015. — № 4. — Режим доступа : http://www.expeducation.ru/ru/article/view?id=5527. — Дата доступа : 12.02.2019.
2. *Ярикова, А. Б.* Метапредметные компетенции в требованиях ФГОС [Электронный ресурс] / А. Б. Ярикова. — Режим доступа : https: // nsportal. Ru / shkola / materialy-metodicheskikh-obedinenii / library / 2013 / 03 / 01 /metapredmetnye-kompetentsii-v. — Дата доступа : 24.09.2018.
3. *Борытко, Н. М.* Онтологическое понимание современного воспитания [Электронный ресурс] / Н. М. Борытко // Интернет-журнал «Эйдос». — 2007. — 1 марта. — Режим доступа : http://www.eidos.ru/journal/2007/0301-4.htm. — Дата доступа : 12.03.2018.
4. *Лузина, Л. М.* Бытийный (онтологический) подход к воспитанию / Л. М. Лузина // Стратегия воспитания в образовательной системе России : подходы и проблемы / под ред. И. А. Зимней. — М. : Агентство «Издательский сервис», 2005. — С. 141—154.
5. *Рубинштейн, С. Л.* Человек и мир / С. Л. Рубинштейн // Бытие и сознание. Человек и мир. — СПб. : Питер, 2003. — С. 282—426.
6. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская мова» (5—11 класы) (праект) / Г. М. Валочка [і інш.] // Роднае слова. — 2016. — № 1. — С. 53—60.
7. *Зелянко, В. У.* Навучанне беларускай мове : лінгвакультуралагічны падыход. 10—11 класы / В. У. Зелянко. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. — 136 с.
8. Основные результаты международного исследования образовательных достижений учащихся PISA-2009 : Аналитический отчёт / под науч. ред. Г. С. Ковалёвой. — М. : МАКС Пресс, 2012. — 176 с.
9. Метапредметные результаты : Стандартизированные материалы для промежуточной аттестации : 7 класс : пособие для учителя / Г. С. Ковалёва [и др.] ; под ред. Г. С. Ковалёвой. — М. ; СПб. : Просвещение, 2016. — 167 с.
10. *Валочка, Г. М.* Фарміраванне чытацкай пісьменнасці ў працэсе навучання беларускай мове / Г. М. Валочка // Роднае слова. — 2017. — № 6. — С. 50—55.


*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 11.03.2019.*

# Виды рефлексии на уроках иностранного языка

**В. М. Кречик,**
учитель немецкого языка учебно-педагогического комплекса
Большешиловичский ясли-сад-базовая школа
Слонимского района Гродненской области

Ещё несколько лет назад термином «рефлексия» в школе мало кто оперировал. Обычно на завершающем этапе урока учитель просто подводил итоги своей деятельности и деятельности учащихся. Сегодня же термин «рефлексия» прочно вошёл в практику каждого учителя.

Слово **рефлексия** происходит от латинского ***reflexio* — обращение назад,** самоанализ, самооценка, «взгляд внутрь себя». При этом глубина рефлексии, самоанализа зависят от уровня образованности человека, развитости морального чувства и самоконтроля. Проще говоря, рефлексия — это «разговор с самим собой». Применительно к школе, рефлексия — это этап урока, в ходе которого учащиеся самостоятельно оценивают своё состояние, эмоции, результаты своей деятельности. Предлагается проводить его в конце занятия. При этом учитель играет роль организатора, а главные действующие лица — ученики. Рефлексивный подход помогает учащимся вспомнить, выявить и осознать основные компоненты деятельности — её смысл, типы, способы, проблемы и пути их решения, полученные результаты, а затем поставить цель для дальнейшей работы. Учителю рефлексия помогает контролировать класс и уже в ходе урока видеть, что было понято, а с чем нужно ещё работать.

Использовать рефлексию в современной педагогике — это значит учить учиться. Таким образом, ребёнок понимает, ради чего он изучает данную тему, как она ему пригодится в будущем; какие цели должны быть достигнуты именно на этом уроке; какой вклад в общее дело он может внести, может ли адекватно оценивать свой труд и работу одноклассников. Процесс обучения для учащегося и для учителя становится интереснее и легче.

Осознание учащимися собственной деятельности осуществляется в ходе текущей рефлексии при изучении учебного материала и итоговой, завершающей логически и тематически замкнутый период деятельности.

***Текущая рефлексия*** направлена на активизацию процесса осознания и осмысления осуществляемой в данное время предметной деятельности: её направление, цель, основные этапы, проблемы, противоречия, способы деятельности, результаты. Текущую рефлексию можно подразделить на 3 типа:

- рефлексия деятельности;
- рефлексия по содержанию учебного материала;
- рефлексия, направленная на выявление настроения и эмоционального состояния учащихся.

*Первый тип рефлексии* даёт возможность осмыслить способы и приёмы работы с учебным материалом, передать усвоенное в сжатой форме, выделяя главное. В практике обучения иностранным

языкам для реализации данного типа рефлексии могут использоваться следующие приёмы:

1. Самооценка активности на каждом этапе урока.
2. «Лестница успеха». Если учитель ведёт урок в традиционной форме, то можно выделить и написать на доске этапы деятельности. В конце урока предложить учащимся оценить свою работу на каждом из них в виде ступенек, ведущих к успеху.
3. «Ключевые слова». Учитель выбирает из текста четыре—пять ключевых слов и записывает их на доске. Далее учащимся предлагается несколько вариантов работы.
4. «Я сделал!». Учитель предлагает учащимся проанализировать свою работу и обменяться с партнёром мнением о знаниях, навыках и умениях, которые они усвоили или проявили в ходе выполнения определённого упражнения, задания, вида деятельности.

Рефлексию деятельности удобно применять при проверке домашних заданий, на этапе закрепления материала, при защите проектов, что помогает ученикам осмыслить виды и способы работы, проанализировать свою активность и, конечно, выявить пробелы.

Вот несколько примеров рефлексии деятельности:

1. «Лесенка успеха»— нижняя ступенька, у «человечка» руки опущены — у меня ничего не получилось; средняя ступенька, у «человечка» руки разведены в стороны — у меня были проблемы; верхняя ступенька, у «человечка» руки подняты вверх — мне всё удалось.
2. «Наряди ёлку» — успешно выполнил задание — повесил шарик, были ошибки — шарик остался возле ёлки.
3. «Поезд». На доске поезд с вагончиками, на которых обозначены этапы урока. Детям предлагают опустить «весёлое личико» в тот вагончик, который указывает на задание, которое было интересно выполнять, а «грустное личико» — в тот, который символизирует неинтересное задание. Можно использовать только один жетон по усмотрению ученика.
4. «Поляна». На доске — поляна из цветов, над каждым цветком — название этапа урока (работа с текстом, фонетическая зарядка и т. д.). Детям предлагается прикрепить свою бабочку на цветок, который символизирует понравившийся вид деятельности.

Тем же задачам служат рефлексии «Дерево успеха», где каждый листочек имеет свой определённый цвет: зелёный — все сделал правильно, жёлтый — встретились трудности, красный — много ошибок; «Вагончики», где в вагончик, соответствующий определённому заданию, учащиеся «усаживают» человечков (животных) либо оставляют жетончик у себя.

Благодаря подобным приёмам перед учителем всегда будет наглядная картина: что поняли и осознали ребята, а над чем нужно ещё поработать.

*Рефлексия содержания материала* даёт возможность учащимся оценить эффективность собственной работы на уроке и выяснить, как они усвоили содержание изученного. Важно подводить итоги, привлекая ребят к самоанализу, в ходе которого выясняется, чему они научились, какие умения проявили. Вначале анализ проводится в парах, затем один из учеников анализирует результаты урока перед всей группой (на каждом уроке этот анализ делает другой ученик).

В практике обучения иностранным языкам для реализации данного типа рефлексии могут использоваться следующие приёмы:

1. Приём незаконченного предложения.

Я считаю, что урок был полезен для меня потому, что...

Я думаю, мне удалось...

Считаю, что я усвоил...

Теперь я точно буду знать, что...

2. Приём рефлексии в форме синквейна (пятистишия), который является моментом соединения старого знания с новым – осмысленным, а также в форме инсерта. Название приёма Insert представляет собой аббревиатуру:

I — interactive (интерактивная)
N — noting (познавательная)
S — system for (система)
E — effective (для эффективного)
R — reading (чтения)
T — thinking (и размышления).

Причём учащиеся должны заранее знать условные обозначения: «v» — уже знал, «+» — новое, «–» — думал иначе, «?» — не понял, есть вопросы. Иногда используются такие обозначения: «+» — знал,«!» — новый материал (узнал), «?» — хочу узнать. Синквейн, инсерт, а также кластер, диаманта, ПОПС зарекомендовали себя весьма эффективно. С одним «но»: учитель должен использовать их постоянно, чтобы дети могли привыкнуть к такой работе. Иначе создание того же синквейна превратится в рутинную работу, а не в позитивное и эффектное завершение темы.

3. Приём «Подведение итогов». Каждый ученик формулирует итоги урока, используя схему, где он соединяет и обобщает свои впечатления, знания, умения.

*Третий тип рефлексии* целесообразно использовать в начале и конце урока с целью установить эмоциональное состояние учащихся, увидеть, как меняется их настроение на уроке.

В начале урока эмоциональную рефлексию проводят ради установления контакта с классом. Можно поставить музыку (подобрав мотив, согласующийся с темой), процитировать классика, зачитать эмоциональное стихотворение. После этого обязательно следует спросить трёх—четырёх учеников: «Что ты чувствуешь сейчас? Какое настроение у тебя?» Учащиеся (даже самые маленькие) привыкают оценивать своё состояние, эмоции, а также учатся аргументировать свою точку зрения. Кроме того, такая рефлексия поможет учащимся настроиться на восприятие темы.

При организации рефлексии на выявление эмоционального состояния в конце урока можно воспользоваться следующими приёмами.

1. Учащиеся получают карточки с изображениями трёх лиц: весёлого, нейтрального и грустного. Им предлагается выбрать карточку, которая соответствует их настроению: Wählt eure Stimmung!
2. Приём «Букет настроения» или «Ваза фруктов». В начале урока учащиеся получают бумажные цветы: красные и белые. На доске изображена ваза. В конце урока учитель обращается к классу: «Wenn die Stunde für euch gut war, dann nehmt ihr rote Blume, wenn die Stunde langweilig war, nehmt ihr weiβe Blume». (Если ваза с фруктами, то используются хурма и лимон.) Этот вид рефлексии практикуется в начальной школе.

Рефлексию настроения и эмоциональности легче всего проводить с учениками младших классов. Вариантов много — раздаточные карточки со смайликами или знаковыми картинками, показ большого пальца (вверх/вниз), поднятие рук, сигнальные карточки и т. д. Данный вид рефлексии удобнее проводить после объяснения новой темы или на этапе закрепления темы и т. д.

Один из видов данной рефлексии — *облако «тегов»,* которые необходимо дополнить. Например, на интерактивной доске можно вывести слайд, где указаны следующие варианты:

Сегодня я узнал...
Было трудно...
Я понял, что...
Я научился...
Я смог...
Было интересно узнать, что...
Меня удивило...
Мне захотелось...
Я обязательно усвою, что ... и т. д.

Каждый ученик выбирает 1—2 предложения и заканчивает их. Работать можно устно или письменно (на листочках или прямо в тетради).

*Графическая рефлексия*. На доске таблица со знаками:

| Цели урока | + (всё понятно) | – (ничего не понял) | ? (интересно, хочу узнать подробнее) |
|---|---|---|---|
| | | | |

В таблице цели урока можно записать самому учителю (для учеников младших классов). Со старшими можно определять цели совместно. В конце урока учащиеся ставят плюсы в графе напротив той цели, которую они считают более приемлемой.

Можно использовать также следующие приёмы рефлексии.

*«Три М»*.

Учащимся предлагается назвать три момента, которые у них получились особенно хорошо в процессе урока, и предложить одно действие, которое улучшит их работу на следующем уроке.

*Акрослово*.

Например: «Что значит для вас слово Sprache?»

S — Schule
P — Persőnlichkeit
R — Ruhe
A — Aufmerksamkeit
Ch — Chaos
E — Ehrlichkeit

*Фразеологизм или пословица*.

Подберите выражение, соответствующее вашему восприятию урока: «слушал краем уха», «хлопал ушами», «шевелил мозгами», «считал ворон» и т. д. (Эти идиоматические выражения пишутся (на немецком языке) либо на доске, либо на карточках).

**Итоговая рефлексия** отличается от текущей бóльшим объёмом рефлексируемой деятельности и бóльшей формализованностью. Её содержание и приёмы определяет учитель на основе образовательной программы. Итоговую рефлексию проводят в виде специального занятия после изучения большого раздела учебного предмета или, например, в конце учебного года. Ученикам предлагается ответить на вопросы: Каков мой самый большой успех за этот год? Благодаря чему я смог его добиться? В чём состоят мои трудности? Как я их преодолею? Что у меня раньше не получалось, а теперь получается? и т. д.

Всё вышесказанное позволяет сделать вывод, что использование приёмов, позволяющих провести рефлексию на уроке иностранного языка, может побудить учащихся принимать на себя ответственность за своё учение, сделать обучение иностранному языку более эффективным.

Существует несколько классификаций рефлексии как этапа урока. Зная их, учителю удобнее варьировать и комбинировать приёмы, включая рефлексию в план урока.

**По содержанию** рефлексия может быть символической, устной и письменной.

Символическая — когда ученик просто выставляет оценку с помощью символов (карточек, жетонов, жестов и пр.). Устная предполагает умение ребёнка связно высказывать свои мысли и описывать эмоции. Письменная — самая сложная, занимает больше всего времени. Она уместна на завершающем этапе изучения целого раздела учебного материла или большой темы.

**По форме деятельности** рефлексия делится на: коллективную, групповую, фронтальную, индивидуальную.

Именно в таком порядке удобнее приучать детей к данному виду работы. Сначала — всем классом, потом — в отдельных группах, затем — выборочно опрашивая учащихся. Это подготовит учащихся к работе над собой.

Желательно адаптировать форму проведения рефлексии под возраст детей. Естественно, что в 10 класс с гномиками и зайками не пойдёшь. Но и в младших классах не стоит слишком увлекаться красочными картинками. Выберите один ва-

риант, чтобы ученики привыкли к нему и не приходилось каждый раз объяснять значения картинок или жестов.

Выделяют также рефлексии:

- физическую (успел — не успел);
- сенсорную (самочувствие: комфортно — дискомфортно);
- интеллектуальную (что понял, что осознал — что не понял, какие затруднения испытываю);
- духовную (стал лучше/хуже).

Рефлексия может осуществляться не только в начале или в конце урока, как это принято считать, но и на любом его этапе. Направленная на осознание пройденного пути, сбор в общую копилку замеченного и обдуманного, она ставит перед учеником цель не просто уйти с урока с зафиксированным результатом, а выстроить смысловую цепочку, сравнить свои способы и методы с другими.

Например, упражнение *«Плюс-минус-интересно»* позволяет учителю посмотреть на урок глазами учеников, проанализировать его с точки зрения ценности для каждого ученика.

Это упражнение можно выполнять как устно, так и письменно, в зависимости от наличия времени. Для письменного выполнения предлагается заполнить таблицу из трёх граф.

В графу «П» — «плюс» записывается всё, что понравилось на уроке, информация и формы работы, которые вызвали положительные эмоции, либо, по мнению ученика, могут быть ему полезны для достижения каких-то целей.

В графу «М» — «минус» записывается всё, что не понравилось на уроке, показалось скучным, осталось непонятым, или информация, которая, по мнению ученика, кажется бесполезной с точки зрения решения жизненных ситуаций.

В графу «И» — «интересно» учащиеся вписывают все любопытные факты, о которых узнали на уроке, и о чём бы ещё хотелось узнать по данной проблеме, вопросы к учителю.

С этой же целью можно использовать таблицу:

| Понятие | Знал | Узнал | Хочу узнать |
|---|---|---|---|
| | | | |

Или «Метод пяти пальцев»:

**М** (мизинец) — мыслительный процесс. Какие знания, опыт я сегодня получил?

**Б** (безымянный) — близость цели. Что я сегодня делал и чего достиг?

**С** (средний) — состояние духа. Каким было сегодня преобладающее настроение?

**У** (указательный) — услуга, помощь. Чем я сегодня помог, чем порадовал или чему поспособствовал?

**Б** (большой) — бодрость, физическая форма. Каким было моё физическое состояние сегодня? Что я сделал для своего здоровья?

В конце урока каждый учащийся благодарит за сотрудничество одного из своих одноклассников и поясняет, в чём именно это сотрудничество проявилось. Благодарственное слово педагога является завершающим. При этом он выбирает тех, кому досталось наименьшее количество комплиментов, стараясь найти убедительные слова признательности и этим участникам.

*Материал поступил в редакцию 31.10.2018.*

# Вывучэнне тэмы «Скланенне і правапіс лічэбнікаў» у Х класе

**Г. М. Саланкова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
гімназіі імя Янкі Купалы г. Мазыра

**Мэта:** мяркуецца, што да канца ўрока вучні будуць **ведаць** асаблівасці скланення і правапісу колькасных і парадкавых лічэбнікаў; **умець** утвараць і ўжываць іх склонавыя формы ў адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі, спалучаць зборныя лічэбнікі з назоўнікамі.

**Задачы** асобаснага развіцця:
- выпрацоўваць здольнасць выяўляць у сваім і чужым маўленні адхіленні ад марфалагічных норм пры ўжыванні лічэбнікаў;
- развіваць уменні самастойнай працы пры выкананні заданняў, звязаных з правапісам і скланеннем лічэбнікаў;
- садзейнічаць развіццю фінансавай граматнасці вучняў.

**Абсталяванне:** карткі, тэксты.

## ХОД УРОКА

### I. Арганізацыйны момант.

***Настаўнік:***

— Добры дзень! Я рада вітаць вас на чарговай сустрэчы з родным словам. Спадзяюся, што ў вас добры настрой і вам хочацца знаёміцца з новым, цікавым, спасцігаць яго і ісці наперад.

Сёння мы працягваем вывучаць лічэбнік як часціну мовы.

**Мэтавызначэнне.**

На дошцы запісаны словы, з дапамогай якіх вучні фармулююць мэты ўрока:

*Даведаемся...*
*Навучымся...*
*Зможам прымяняць...*

### II. Праверка дамашняга задання.

**1. Франтальнае вуснае апытанне (прыём непаднятай рукі).**

1. Што такое лічэбнік? *(Часціна мовы, якая абазначае лік, колькасць прадметаў, а таксама парадак прадметаў пры лічэнні.)*
2. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі ў залежнасці ад значэння і граматычных прымет? *(Колькасныя, парадкавыя.)*
3. Якія лічэбнікі называюцца колькаснымі? *(Якія абазначаюць лік або колькасць прадметаў і адказваюць на пытанне: колькі?)*
4. Якія лічэбнікі называюцца парадкавымі? (*Якія абазначаюць парадак прадметаў і адказваюць на пытанні: які? каторы?)*
5. Якім членам сказа могуць быць колькасныя лічэбнікі? *(Любым.)*
6. Якую сінтаксічную ролю звычайна выконваюць парадкавыя лічэбнікі? *(Азначэнне.)*
7. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле складу? *(Простыя, складаныя, састаўныя.)*
8. На якія разрады падзяляюцца колькасныя лічэбнікі? *(Лічэбнікі, якія абазначаюць цэлыя лікі; дробавыя; зборныя.)*

**2. Праверка дамашняга задання.**

1) Індывідуальная работа двух вучняў каля дошкі (праца з практ. 298).

Першы вучань запісвае выпісаныя з тэксту словазлучэнні з лічэбнікамі, тлумачыць іх правапіс.

Другому вучню даецца заданне на паўтарэнне правапісу прыналежных прыметнікаў:

(дзядуля) акуляры –
(воўк) след –
(бусел) гняздо –
(цётка) ліст –
(Саша) заплечнік –
(дачка) паліто –
(Кузьма) сусед –
(Зоська) бацькі –
(дзядзька) часопіс –
(недарэка) словы –
(ляснік) хатка –
(Коля) сябар –
(Ядзвіга) хустка –
(ластаўка) хвост –
(Сяргей) загад –
(сястра) капялюш –

2) Некалькі сшыткаў настаўнік бярэ для праверкі дамашняга практыкавання.

3) Заданне для ўсяго класа (пакуль вучні працуюць каля дошкі): практыкаванне 299. Прачытаць тэкст, вызначыць разрады лічэбнікаў.

**III. Тлумачэнне новага матэрыялу.**

***Настаўнік:***

— Наша жыццё цяжка ўявіць без лічбаў. Людзям любой прафесіі — ці гэта ўрач, ці шафёр, ці настаўнік, ці прадавец — патрэбны веды пра лічэбнік, бо з ім даводзіцца сустракацца і ўжываць яго ў маўленні штодня. Уменне правільна ўтвараць і ўжываць лічэбнік у вуснай і пісьмовай мове — гэта паказчык маўленчай культуры чалавека.

Лічэбнік як самастойная часціна мовы мае пэўныя марфалагічныя прыметы:

- усе колькасныя лічэбнікі, акрамя *дзевяноста, паўтара, паўтары,* скланяюцца;
- колькасны лічэбнік *дзевяноста* мае адну склонавую форму;
- колькасныя лічэбнікі *сорак* і *сто* маюць дзве склонавыя формы;
- колькасны лічэбнік *адзін* і ўсе парадкавыя змяняюцца па родах і ліках;
- лічэбнікі *два, дзве, абодва, абедзве, паўтара* і *паўтары* змяняюцца па родах;
- пераважная большасць колькасных лічэбнікаў, за выключэннем *адзін, тысяча, мільён, мільярд,* не мае граматычных катэгорый роду і ліку.

А зараз давайце звернемся да правіла на старонках падручніка 187—188.

**IV. Фізкультхвілінка.**

**V. Замацаванне.**

**1. Першаснае (вербальнае) замацаванне. Праца з тэкстам (калектыўная).**

**5 рублёў**

Банкнот уведзены ў абарачэнне 1 ліпеня 2016 года. Яго памер складае 135 х 72 мм.




На пярэднім боку — выява Белай (Камянецкай) вежы ў г. Камянцы Брэсцкай вобласці.



На адваротным боку размешчаны калаж, прысвечаны першым славянскім паселішчам (фрагмент скуранога пояса, драўлянае кола, малюнак старажытнага дзядзінца «Бярэсце»).

Вадзяны знак — лакальны паўтонавы малюнак фрагмента асноўнай выявы пярэдняга боку банкнота.

Ахоўная нітка металізаваная, аконнага (нырaючага) тыпу, якая выходзіць на паверхню пярэдняга боку ў выглядзе прамавугольнікаў. Пры разгляданні банкнота на прасвет ахоўная нітка выглядае скразной цёмнай паласой з негатыўным (светлым) тэкстам у прамой і перавернутай выяве.

Ёсць і схаваная (латэнтная) выява. Пры разглядзе банкнота пад вуглом на ўзроўні вачэй у прамавугольніку можна ўбачыць літары «РБ».



Асноўная выява пярэдняга боку банкнота, лічбавае і літарнае абазначэнне наміналу, тэкст «НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» і паметка для людзей з аслабленым зрокам маюць павялічаную таўшчыню фарбавага слою, дзякуючы чаму добра ўспрымаюцца навобмацак.

Тэксты БЕЛАРУСЬ, НБРБ, якія бесперапынна паўтараюцца, і лічбавае абазначэнне наміналу, аддрукаваныя на пярэднім і адваротным баках банкнота, чытаюцца пры павелічэнні.




На пярэднім боку ахоўныя валокны люмінесцыруюць жоўта-зялёным колерам.




На адваротным боку: люмінесцыруе прамавугольнік зялёнага колеру з лічбай «5», гарызантальны серыйны нумар — аранжавым колерам і ахоўныя валокны — жоўта-зялёным колерам.

*Заданні да тэксту.*

1. Запішыце словамі ўсе лічэбнікі разам з назоўнікамі (1—2 балы).
2. Вызначце разрады лічэбнікаў (3—4 балы).
3. Праскланяйце па аднаму лічэбніку з кожнага разраду (5—6 балаў).
4. Вызначце стыль тэксту. Запішыце яго ў назоўным склоне (7—8 балаў).
5. Знайдзіце ў тэксце слова, якое адпавядае значэнню *цэнтральная ўмацаваная частка горада ў Старажытнай Русі, якая служыла сядзібай князю ці яго намесніку і выконвала ваенныя, адміністрацыйныя і палітычныя функцыі.* Запішыце яго ў той форме, у якой яно пададзена ў тэксце (9—10 балаў).

**2. Трэніровачнае замацаванне.**
**Праца па групах.**

***Заданне 1-й групе.*** Запішыце спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі, раскрыўшы дужкі і замяніўшы лічбы словамі.

*1 (акно, вароты, гадзіна, дзень); 2 (год, студэнт, суткі, хвіліна); 4 (дзяжурны, момант, сустрэча, цяля); 18 (вясна, год, стагоддзе); 44,4 (гектар, літр, тона); 15 3/7 (адлегласць, кіламетр, шлях).*

***Заданне 2-й групе.*** Практыкаванне 304, с. 190 (вусна пераказаць змест тэксту).

***Заданне 3-й групе.*** Утварыце і запішыце колькасна-іменныя спалучэнні наступных слоў з лічэбнікамі *чатыры* і *чацвёра* (пры гэтым улічыце магчымасць спалучэння іменных часцін мовы як з абодвума лічэбнікамі, так і толькі з адным з іх).

*Акно, аспірант, вартавы, верабей, вёска, гектар, гусі, дачка, дзеці, дзяжурны, казах, кніга, коннік, літр, медзведзяня, партфель, птушка, ручка, студэнт, ягня.*

**3. Творчае замацаванне.**

**Заданне для ўсяго класа (калектыўная праца).**

**1.** Рашыце прыклады і запішыце словамі арыфметычныя выразы.

| | |
|---|---|
| 18 888 + 11 = | 77 836 − 81 = |
| 1 725 + 204 = | 584 − 90 = |
| 1/3 + 1/5 = | 2/15 − 1/18 = |
| 2,5 + 4,04 = | 4 5/7 − 1 7/9 = |
| 3,18 x 7,01 = | 8,15 : 2,03 = |

**2.** Праскланяйце пісьмова колькасна-іменныя спалучэнні.

*52 гады; 2005-ы год; 304 дні; 64 дрэвы; 1,5 капейкі; 1,5 рубля; 49 248 тон; 831 чалавек; 338 школьнікаў; 22 яблыкі.*

Рэалізацыя пастаўленых задач забяспечваецца праз урокі роднай літаратуры, у змесце якіх асноватворным з'яўляецца зварот да «малой радзімы» пісьменніка. Беларусь — краіна таленавітых людзей, дзе кожная мясцовасць мае свайго героя, гістарычную постаць, асобу, творцу.

Адзін з найважнейшых сродкаў выхавання патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў — **музей.** Значэнне музейна-педагагічнай дзейнасці ў справе выхавання моладзі падкрэсліваецца ў Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2016—2020 гады. Там знаходзім пералік мерапрыемстваў, якія накіраваны на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму ў выхаванцаў устаноў адукацыі нашай рэспублікі. Сярод важных мерапрыемстваў называецца і выкарыстанне сродкаў музейнай педагогікі, якое заключаецца ў «развіцці сеткі школьных музеяў, арганізацыі даследчай работы на базе музеяў, папаўненні экспазіцыі музеяў, правядзенні конкурсу віртуальных музеяў» [4].

Гэтыя формы працы, звязаныя з пашырэннем супрацоўніцтва музея і ўстаноў адукацыі, з развіццём музейна-педагагічнай дзейнасці, узнікаюць не на пустым месцы, а маюць сувязь з папулярызацыяй дзейнасці музея як установы культуры і актуалізацыяй яго адукацыйнай дзейнасці ў грамадстве. Такі вопыт існуе як далёка за межамі нашай дзяржавы, напрыклад у Германіі (дзе і ўзнікла музейная педагогіка як навука), так і ў суседніх дзяржавах (Расія і Украіна).

Музеі сёння ўспрымаюцца як месца, дзе збіраецца, канцэнтруецца, асвойваецца інфармацыя аб культурным развіцці грамадства. Да таго ж гэта ўстанова не проста назапашвае і захоўвае найкаштоўнейшыя здабыткі чалавецтва, але і папулярызуе іх сярод наведвальнікаў, займаецца навукова-даследчай дзейнасцю. Нягледзячы на тое, што існуе вялікая запатрабаванасць у выкарыстанні музейна-педагагічнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі і на дзяржаўным узроўні акрэслены яе мэты, усё ж сістэмнага падыходу да распрацоўкі такіх формаў работы не назіраецца. Такім чынам, актуалізуецца неабходнасць распрацоўкі метадалагічных падыходаў да рэалізацыі названых відаў дзейнасці.

У педагагічнай навуцы ў Рэспубліцы Беларусь праблемы выкарыстання магчымасці музея ва ўстановах адукацыі закраналіся ў даследаваннях В. У. Буткевіч [5], В. М. Варановіч [6], І. Г. Лупашкі [7; 8], В. У. Міронччык [9] і іншых. Пры гэтым акцэнт у большасці даследаванняў ставіцца на развіццё адукацыйна-асветніцкай дзейнасці ў музеях, а праблемы арганізацыі дзейнасці педагогаў у дадзеным напрамку знаходзяцца па-за ўвагай.

Таму мэтай гэтага артыкула з'яўляец-

ца раскрыццё праблемы метадычнай арганізацыі дзейнасці педагогаў па выкарыстанні экспанатаў музея як сродку развіцця цікавасці ў навучэнцаў да малой радзімы пісьменніка.

Шматаспектнасць дзейнасці музея заслугоўвае больш пільнай увагі, патрабуе тэарэтычнага і навукова-метадычнага абгрунтавання яго выхаваўчых і адукацыйных магчымасцей, што, на нашу думку, магло б зрабіць педагагічны працэс больш эфектыўным. Насыціўшы яго (працэс) эмоцыямі, светапоглядными ідэямі і перакананнямі, яны карэнным чынам паўплываюць на якасць ведаў, што засвойваюцца, фарміруючы ў свядомасці асобы цэласны вобраз прадмета (на аснове зрокавага і эмацыянальнага ўспрымання, інфармацыйнай значнасці і эстэтычнага аздаблення прадмета). Па вызначэнні вядомых расійскіх музейных педагогаў А. Г. Ванславай, А. К. Ламуновай, «веды ў музеі засвойваюцца разам са светапогляднымі ідэямі, маральнымі каштоўнасцямі і нормамі, эстэтычнымі ідэаламі» [10, с. 47].

Азначэнне паняцця «музей», якое ў комплексе ілюструе ўсю яго дзейнасць, даецца ў падручніку па «Музеязнаўстве»: «Музей — гістарычна абумоўлены шматфункцыянальны інстытут сацыяльнай інфармацыі, прызначэнне якога ў захаванні культурна-гістарычных і прыродазнаўчых каштоўнасцей, назапашванні і распаўсюджванні інфармацыі пры дапамозе музейных прадметаў. Дакументуючы працэс і з’явы прыроды і грамадства, музей камплектуе, захоўвае, даследуе калекцыі музейных прадметаў, а таксама выкарыстоўвае іх у навуковых, навучальна-выхаваўчых і прапагандысцкіх мэтах» [11, с. 18]. Як бачна, музей — гэта скарбонка каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам, «найважнейшых сведчанняў гісторыі», якія могуць быць мэтанакіравана выкарыстаны ў адукацыйным працэсе. Сучаснае азначэнне музея і яго функцый знаходзім у Расійскай музейнай энцыклапедыі: «Музей (лац. *museum,* ад гр. *museion* = храм муз) — культурная форма, гістарычна выпрацаваная чалавецтвам для захавання, актуалізацыі і трансляцыі наступным пакаленням найбольш каштоўнай часткі культурнай і прыроднай спадчыны» [12]. Гэту важную грамадскую і асветніцкую місію музей пашырае і на адукацыйныя ўстановы, прапануючы наведвальнікам розныя віды экскурсій, музейных заняткаў, забаўляльных і гульнявых мерапрыемстваў. Як справядліва адзначае даследчык дзейнасці музеяў Е. Г. Плытнік, сучасны «музей становіцца месцам дыялогу, пляцоўкай для культурнага абмену, творцам новых і захавальнікам старых каштоўнасцей» [13, с. 67].

Музей, яго дзейнасць, галоўныя мэты якой «абараняць, ратаваць і захоўваць найкаштоўнейшае грамадскае багацце і арганізоўваць яго сустрэчу з людзьмі» [14, с. 43], і на сённяшні дзень у полі зроку навукоўцаў, сацыёлагаў, педагогаў, мастацтвазнаўцаў. Найважнейшая функцыя музея — выхаваўча-адукацыйная — заключаецца ў тым, што экспанат павінен эмацыянальна ўздзейнічаць на гледача і адначасова выклікаць асацыяцыі з яго ўласным жыццёвым вопытам, а не быць проста відовішчам [15].

Такім чынам, можна выдзеліць наступныя перавагі выкарыстання сродкаў музея ў аптымізацыі педагагічнага працэсу:

- дзейнічае як шматфункцыянальны сацыяльны інстытут;
- вядзе навукова-даследчую і навукова-асветніцкую дзейнасць;
- камплектуе, захоўвае, вывучае, папулярызуе помнікі прыродазнаўчай гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры народа;
- выкарыстоўвае музейныя прадметы ў адукацыйных і прапагандысцкіх мэтах;
- з’яўляецца месцам для культурнага дыялогу;
- уздзейнічае на светапогляд наведвальнікаў, іх эмацыянальны стан;
- набліжае гісторыю да асобы, яе ўласнага вопыту.

Вельмі важна названыя ўласцівасці «храма муз» эфектыўна прымяняць на ўроках літаратуры, у прыватнасці пры развіцці цікавасці навучэнцаў да малой радзімы пісьменніка. З гэтай мэтай ва ўста-

новах адукацыі могуць выкарыстоўвацца музеі самага рознага профілю: гістарычнага, краязнаўчага, літаратурнага, школьнага.

Комплекснае ўздзеянне на асобу навучэнцаў сродкамі музея пры развіцці іх цікавасці да малой радзімы пісьменніка, на нашу думку, дасягаецца за кошт:

— **фарміравання ў свядомасці асобы яркіх наглядных вобразаў прадметаў.** Напрыклад, сродкамі Літаратурна-мемарыяльнага музея-сядзібы Францішка Багушэвіча ў Кушлянах Смаргонскага раёна ў навучэнцаў ствараецца яркае ўражанне ад рэчаў, якія яшчэ ўтрымліваюць у сабе энергетыку паэта, з творчасці якога пачалося фарміраванне літаратурнай мовы: пісьмовы стол, крэслы, рукапісы, родавыя медальёны сям'і Багушэвічаў, гісторыя якіх сягае аж у XVIII стагоддзе;

— **уяўлення навучэнцам рэальнай зрокавай карціны гістарычных падзей.** У тых жа Кушлянах, дзе знаходзіцца музей Францішка Багушэвіча, захавалася хата паэта 1896 года пабудовы і каменная абора. Захаваўся стары парк, дзе ёсць дрэвы, пасаджаныя ў XVIII і XIX стагоддзях. Сядзіба і сёння дае магчымасць уявіць, як выглядаў шляхецкі маёнтак у XIX стагоддзі;

— **усведамлення значнасці музейных прадметаў, іх каштоўнасна-сэнсавай сутнасці з дапамогай прыкладаў і каларытных слоўных вобразаў.** Пры вывучэнні творчасці Максіма Гарэцкага варта звярнуць увагу навучэнцаў на тое, што хоць сядзіба пісьменніка ў Малой Багацькаўцы (што на Мсціслаўшчыне ў Магілёўскай вобласці) занядбана і мае мала наведвальнікаў, прадметы побыту, інфармацыя пра ўмовы сталення Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, атмасфера, якая пануе ў музеі, дае магчымасць глыбей асэнсаваць творчасць самога мастака слова. Рэальная карціна беларускай вёскі, якая паўстае ў яго творах, выклікае дваякае стаўленне да малой радзімы: бязмерная любоў і горыч шкадавання ад заняпаду, у якім яна апынулася. І тут ужо кожная побытавая рэч, убачаная ў музеі, набывае своеасаблівы каштоўнасны сэнс;

— **прадстаўленай магчымасці асэнсавання ролі асобы (народа, этнасу) у гістарычнай эпосе як яркага прыкладу для пераймання.** Прафесар В. У. Буткевіч адзначае, што «педагагічныя магчымасці выкарыстання такога сродку, як біяграфіі славутых людзей Рэспублікі Беларусь, з мэтай фарміравання грамадзянскасці заключаюцца ў тым, што ў старшакласнікаў узнікае цікавасць і жаданне пераймаць іх і нават пераўзысці» [5, с. 113]. Так, яркім прыкладам для пераймання можа стаць грамадская і літаратурная дзейнасць Максіма Танка, паэта з бунтарскім характарам і ярка акрэсленай грамадзянскай пазіцыяй. За сваю дзейнасць Яўген Іванавіч Скурко атрымаў шмат дзяржаўных узнагарод, званне народнага паэта Беларусі. Імя Максіма Танка ў сталіцы Беларусі прысвоена педагагічнаму каледжу, Беларускаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту. Яно ўшанавана ў назвах вуліц, бібліятэк, школ. Сваткаўская сярэдняя школа на малой радзіме паэта, дзе знаходзіцца школьны літаратурна-краязнаўчы музей, таксама носіць яго імя. Значная літаратурная і грамадзянская постаць становіцца блізкай і зразумелай праз створаную тут экспазіцыю «Калыска песні паэта».

Шмат скажа навучэнцам пра асобу Максіма Танка запавет, згодна з якім паэт пахаваны на даўніх могілках суседняй з Пількаўшчынай вёскі Слабада, побач з вернай сяброўкай і жонкай Любоўю Андрэеўнай, з бацькамі, родзічамі.

У цэнтры Мядзеля ўстаноўлены велічны помнік паэту. Побач размешчаны валун з выявай разгорнутай кнігі з радкамі з верша паэта «Ёсць адна песня песняў — пра Радзіму»;

— **садзейнічання ўсталяванню асацыятыўных сувязяў наведвальніка з людзьмі гэтай мясцовасці, з лакальнымі падзеямі, падкрэслівання культурнай значнасці ўсяго навакольнага.** Напрыклад, пры вывучэнні

біяграфіі Кузьмы Чорнага варта расказаць пра літаратурны музей у вёсцы Цімкавічы Капыльскага раёна, дзе прайшлі дзіцячыя гады пісьменніка. Неабходна адзначыць, што наш вядомы класік рос і гадаваўся сярод простых людзей, якія цяжка фізічна працавалі, кожны кавалак хлеба і простая кашуля былі здабыты сваёй працай. Продкі пісьменніка былі ткачамі, бо Цімкавічы — былое ткацкае мястэчка. Недалёка ад яго знаходзіцца Скіп'ёўскі лес, любімае месца Міколы Рамаоўскага, якое дало назву няскончанай аповесці пісьменніка. Усё гэта садзейнічае разуменню, у якім свеце жыў Кузьма Чорны, для якога сам чалавек ужо быў цэлым светам, непазнаным, цікавым, загадкавым і шматгранным;

— **стварэння ўмоў для праецыравання гістарычна значных фактаў і з'яў на сучаснае жыццё.** Ацаніць умовы жыцця сучасніка Максіма Гарэцкага ў вёсцы Малая Багацькаўка можна, убачыўшы прадметы побыту тагачаснай вёскі. Навучэнцы з большай цікавасцю ўспрымуць жыццёвую біяграфію Францішка Багушэвіча праз знаёмства з інтэр'ерам беларускай хаткі XIX стагоддзя ў Кушлянах, які дае магчымасць ацаніць эпоху і супрацьпаставіць умовам, у якіх займаюцца творчасцю сучасныя паэты і пісьменнікі;

— **насычэння свядомасці наведвальніка эмацыянальнымі вобразамі прадметаў культуры і побыту народаў і дзяржаў мінулага.** Лёс Максіма Танка цесным чынам звязаны з палітычнай сітуацыяй у краіне, калі Беларусь была ў складзе Польшчы; Францішак Багушэвіч пісаў свае творы, калі наша краіна не мела дзяржаўнасці і літаратурнай мовы; Уладзімір Караткевіч шукаў адказ на праблемы сучаснага жыцця ў гістарычным мінулым. Пра ўсё гэта распавядаюць музейныя прадметы, як «арэчаўляючы» эпоху, так і «ажыўляючы» асобу ў ёй;

— **уплыву на эмацыянальны стан асобы, яе светапогляд, перакананні, патрэбы, асобасныя каштоўнасці.** Музей Уладзіміра Караткевіча ў Оршы адкрыты да 70-годдзя паэта ў 2002 годзе і дзейнічае як філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. Што можа ўразіць навучэнцаў з біяграфіі любімага многімі і папулярнага сярод моладзі класіка беларускай літаратуры, гарадскога жыхара, які нарадзіўся ў сям'і інтэлігентаў: атэстат сталасці з выдатнымі і добрымі адзнакамі, самавар, які браў у вандроўкі У. Караткевіч, ці верш пра сваю маці, напоўнены глыбокай любоўю?:

*У горадзе без тралейбусаў, над імклівай нямоўчнай ракой,*
*На вуліцы Касманаўтаў — хата маці маёй,*
*На вуліцы Касманаўтаў, дзе ўлетку бубняць чмялі,*
*На самай мне любай вуліцы з усіх, што ёсць на зямлі...*

Напэўна, усё тут гаворыць, як глыбока і шчыра паэт любіў сваю радзіму і блізкіх яму людзей;

— **актывізацыі пошукавай дзейнасці вучняў, далучэння іх да заняткаў навуковай дзейнасцю ў музеі.** Цікавы факт, пачуты ў музеі, у спалучэнні з моцным эмацыянальным уражаннем, як правіла, падахвочвае да таго, каб даведацца аб гістарычным факце або асобе яшчэ больш, прачытаць пра гэта ў кнізе, знайсці ў сетцы Internet. Кансультацыі па прадмеце для рэферата, даклада часта становяцца пачаткам для напісання навуковай працы ў далейшым. Сёння інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць не проста разгледзець музейныя экспанаты, але і віртуальна прайсці па пакоі, ацаніць комплексна музейную экспазіцыю, як у музеі Францішка Багушэвіча ў Кушлянах. Актывізацыі зацікаўленасці да малой радзімы мастакоў слова паспрыяе шырокае выкарыстанне кантэнту электроннага адукацыйнага рэсурсу па беларускай літаратуры, змешчанага на нацыянальным адукацыйным партале (http://e-vedy.adu.by/);

— **удасканаленне ведаў аб прадмеце з дапамогай яркіх прыкладаў і фарміраванне цэласнага бачання гістарычнай эпохі.** Ацаніць эпоху, у якую жыў той ці іншы творца, дапамагае параўнальная характарыстыка экспазіцый розных музеяў. Так, сціплы інтэр'ер беларускай хаты XIX і пачатку XX стагоддзя адрозніваецца ад пакояў гарадской кватэры Уладзіміра Караткевіча. Заданні такога тыпу выпрацоўваюць у навучэнцаў навыкі складання «слоўніка эпохі», у выніку чаго адбываецца ўсведамленне гістарычных умоў жыцця пісьменнікаў розных эпох;

— **набліжэння ведаў аб прадмеце да арыгіналу.** Толькі ў музеі можна ўбачыць сапраўдныя прылады працы, арыгінальныя дакументы, прадметы побыту, якімі карысталіся гістарычныя асобы, ацаніць памеры таленту, арыгінальнасць і прыгажосць, а галоўнае — адчуць энергетыку, якая належала ўсім вядомай асобе паэта ці пісьменніка;

— **вылучэння эстэтычна значнага і выхавання эстэтычнага густу.** Кожная дробязь, дэталь музейнай экспазіцыі можа выклікаць захапленне, вучыць бачыць прыгожае вакол, няхай гэта будуць вырабы з саломы, прадметы ткацтва, карціны народных мастакоў або проста ручка вядомага паэта. Ужо тое, як размешчаны ў экспазіцыі прадметы, што ілюструюць панараму падзей, іх спалучэнне, аздобленасць, выклікае захапленне, фарміруе эстэтычны густ;

— **фарміравання культуры паводзін, зносін.** У музеі нельга шумець, трэба быць уважлівым, засяроджаным, умець глядзець і бачыць, слухаць і чуць, што так важна для нас і ў паўсядзённым жыцці, дзе ўсё больш значнымі і каштоўнымі становяцца добразычлівасць і спагадлівасць. Уменні назіраць, аналізаваць, выбудоўваць асацыятыўныя сувязі, рабіць высновы накладваюць пэўны адбітак на культуру паводзін і зносін людзей.

Нароўні з ужо наяўнымі сродкамі эфектыўнага ўздзеяння музея на асобу навучэнцаў увесь час ідзе актыўная работа па пошуку новых формаў і метадаў прыцягнення наведвальнікаў. Так, пры музеях арганізуюцца даступныя для грамадзян бібліятэкі, экалагічныя цэнтры, цэнтры правядзення вольнага часу, клубы па інтарэсах і інш., якія дазваляюць павялічыць выхаваўчую прастору музея і пазнавальную прастору канкрэтнай асобы; пашыраецца адкрытасць і агульнадаступнасць музейных экспазіцый, што робіць гэты сацыяльны інстытут вядучым пры фарміраванні асобы, асабліва сферы яе цікавасцяў, у тым ліку і да роднай літаратуры.

Такім чынам, педагагічнае дзеянне па развіцці цікавасці навучэнцаў да малой радзімы пісьменніка вымагае ўвядзення ў адукацыйную прастору некалькіх новых элементаў: па-першае, сучасных тэхналогій навучання і выхавання, арганізацыйных формаў выкарыстання магчымасцей музея ва ўстановах адукацыі; па-другое, педагога, які арганізоўвае гэтую працу: стымулюе, накіроўвае, дапамагае навучэнцу ў яго ўласным пошуку ісціны. Сумесная пошукавая праца, выхад за вузкія рамкі аўдыторыі (рэальна або віртуальна), свабода творчасці — галоўныя складнікі выкарыстання сродкаў музея ў педагагічным працэсе, у тым ліку і на ўроках літаратуры. Наяўнасць у музеях сацыяльна значнай вітагеннай інфармацыі не толькі спрыяе абуджэнню цікавасці ў навучэнцаў да «роднага кута» (Якуб Колас) творцы, але і аказвае на асобу, што знаходзіцца ў працэсе пошуку асабістага «я», выхаваўчае ўздзеянне («Агледзіны жыцця выдатных людзей... узвышаюць душу і ўзбагачаюць духоўна» (В. Р. Бялінскі)).

Як адзначаецца ў канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура», «біяграфіі пісьменнікаў і створаныя імі мастацкія тыпы пры пэўных умовах могуць стаць ідэаламі ці антыідэаламі, з улікам якіх вучні будуць канструяваць сваю мадэль асобы і імкнуцца рэалізаваць яе ў жыцці» [16, с. 53]. Праз развіццё цікавасці да малой радзімы пісьменнікаў у навучэнцаў выхоўваюцца любоў і павага да свайго роднага краю, а ў выніку — і «ласка» (Ф. Скарына) да вялікай Радзімы.

1. Концептуальные подходы к развитию системы образования Республики Беларусь до 2020 года и на перспективу до 2030 года [Электронный ресурс] : приказ Министра образования Республики Беларусь, 29 ноября 2017 г., № 742 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа : http://world_of_law.pravo.by/text.asp?RN=U617E2847. — Дата доступа : 22.02.2019.
2. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи на 2016—2020 годы [Электронный ресурс] : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 15 июля 2015 г., № 82 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа : http://world_of_law.pravo.by/text.asp?RN=U216E2351. — Дата доступа : 22.02.2019.
3. *Мальдзіс, А. І.* Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : Партрэт пісьменніка і чалавека / А. І. Мальдзіс. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 1990. — 230 с.
4. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи на 2016—2020 годы [Электронный ресурс] // Минский городской методический портал. — Режим доступа : http://mp.minsk.edu.by/main.aspx?guid=6581. — Дата доступа : 22.02.2019.
5. *Буткевич, В. В.* Гражданское воспитание детей и учащейся молодёжи : пособие для рук. учреждений образования, педагогов, кл. рук. и студентов / В. В. Буткевич. — Минск : Нац. ин-т образования, 2007. — 280 с.
6. *Воронович, В. М.* Управление учебно-воспитательным процессом средствами музейной педагогики / В. М. Воронович // Кіраванне ў адукацыі. — 2007. — № 12. — С. 53—59.
7. *Лупашка, І. Г.* Музейна-педагагічныя заняткі як адна з формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў (у ракурсе сусветных тэндэнцый) / І. Г. Лупашка // Культура Беларусі і сусвет : агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13—14 лістап. 2008 г. / рэдкал. : Н. А. Ляйко (адказны рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2010. — С. 131—135.
8. *Лупашка, І. Г.* Музей і школа : шляхі ўзаемадзеяння / І. Г. Лупашка // Адукацыя і выхаванне. — 2004. — № 12. — С. 69—73.
9. *Міронччык, В. У.* Аб феномене музейнай педагогікі / В. У. Мірончык // Творчасць. — 2001. — Вып. 1. — С. 15—17.
10. Музей и школа : пособие для учителя / Е. Г. Ванслова [и др.] ; сост. Э. А. Павлюченко ; под общ. ред. Т. А. Кудриной. — М. : Просвещение, 1985. — 192 с.
11. Музееведение : музеи ист. профиля : учеб. пособие для вузов по спец. «История» / под ред. : К. Б. Левыкина, В. Хербета. — М. : Высш. шк., 1988. — 430 с.
12. Словарь музейных терминов. Музей // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.museum.ru/RME/dictionary.asp?40. — Дата доступа : 23.02.2019.
13. *Плытник, Е. Г.* К вопросу о взаимодействии музея и местного сообщества / Е. Г. Плытник // Искусство и культура. — 2018. — № 2. — С. 67—71.
14. *Высоковский, А.* Посетители и потребители / А. Высоковский // Артхроника. — 2003. — № 1. — С. 42—48.
15. *Потапов, А.* Музейный предмет и его эмоциональное восприятие / А. Потапов, Ю. Максименко // Мир музея. — 2004. — № 10. — С. 18—20.
16. *Праскаловіч, В. У.* Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V—XI класы). Праект / В. У. Праскаловіч [і інш.] // Род. слова. — 2016. — № 3. — С. 51—60.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 13.03.2019.*

# Беларускія пасядзелкі «Хата ўцехамі багата»

**Ж. Г. Станоўская,**
настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы № 40 г. Магілёва

**Задачы:**

- прывіваць цікавасць да народных традыцый, фальклору; узбагачаць лексічны запас вучняў;
- развіваць іх творчыя здольнасці;
- выхоўваць у дзяцей цікавасць да народнай культуры праз вывучэнне беларускага фальклору; адказнасць і самастойнасць; уменні працаваць у калектыве.

**Афармленне:** на класнай дошцы ў выглядзе акна — старадаўнія ручнікі, надпіс «Беларускія пасядзелкі», чатыры сталы, накрытыя абрусамі з беларускімі ўзорамі.

**Падрыхтоўчая работа:**

Клас дзеліцца на чатыры групы. Кожны з вучняў атрымлівае адпаведнае заданне: даведацца ў бабуль, дзядуль, мам, тат і іншых дарослых, якія заклічкі, жарты, гульні, анекдоты і загадкі беларусаў яны ведаюць.

На пасядзелкі запрашаюцца таксама дарослыя, якія могуць прадэманстраваць некаторыя жанры вусна-паэтычнай творчасці.

**Прыкладныя этапы пасядзелак:**

**I этап: «Уцеха».**

***Настаўнік:***

— Пасядзелкі пачынаюцца, усе госці збіраюцца. На лавачцы ўсаджваюцца, гуляць і слухаць падрыхтоўваюцца. Прыпаслі мы тут для вас спраў на ўсякі смак: каму казку, каму прыказку, каму вітанні, каму пажаданні. Запрашаю вас, дарагія госці, на нашы пасядзелкі!

Ці ўсе прысутныя ведаюць, што азначае слова «ўцеха»?

Уцеха — ад слова «цешыць», гэта значыць забаўляць. Калісьці ў доўгія восеньскія і зімовыя вечары ў хаце самых гасцінных гаспадароў збіраліся разам хлопцы і дзяўчаты. Гэтыя вечарыны носяць назву пасядзелак (ад слоў «сядзець», «пасядзець»), хоць прыходзілі туды і з якой-небудзь працай.

На пасядзелкі бацькі бралі дзяцей і прыносілі ўсялякія гасцінцы: сланечнік, арэхі, цукеркі, пірагі. Акрамя таго, спявалі песні, жартавалі.

Пакацілася вечарынка,
Зазірнула ноч на двор...
Мы на нашых пасядзелках
Пачынаем разгавор.

Пасядзелкі — гэта не толькі забавы, але і праца, творчасць людзей. Пра гэта піша ў сваім вершы С. Ермакова:

Что такое посиделки?
Это вовсе не безделки:
Это — творчество и труд,
Это — дружба и уют,
Это — песня, это — смех,
Это — радость для нас всех!

**II этап: «Забаўлянка».**

З’яўляецца **Дзед Барадзед.**

— **Я** — Дзед Барадзед! Хачу далучыцца да вашых пасядзелак. Вы згодны?

*(Праводзіць з класам гульню **«Зарадка».**)*

Зарадка — крок на месцы,
А ну, са мною разам!
З медзведзянём — топ-топ,

За качанём — шлёп-шлёп,
За ваверчанём — прыг-прыг,
З жарабём — брык-брык,
Разам з жабай — скок-скок,
Разам з крабам — убок-убок,
Спыняем — прыг-скок!

***Дзед Барадзед:***
— Хто з вас рыхтаваў цікавыя забаўлянкі?
*(Даецца слова дзецям і дарослым, якія выконвалі гэтае заданне. Адна з сем'яў інсцэніруе забаўлянку):*
— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла? — Лыжкі мыла.
— А што далі? — Кавалак сала.
— Дзе паклала? — Пад лаўкаю.
— Чым накрыла? — Халяўкаю.
— Дзе падзела? — Кошка з'ела.

***Дзед Барадзед:***
— Якія вы ўсе малайцы!

***Настаўнік:***
— Ну, а зараз я прапаную вам усім і табе, Дзед Барадзед, успомніць якія-небудзь забаўлянкі. *(Удзельнікі агучваюць свае варыянты.)*

***Настаўнік:***
— Прапаную праінсцэніраваць знаёмую ўсім забаўлянку **«Кую, кую ножку, паеду ў дарожку».**
Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Еду, еду, еду,
Ніяк не даеду.
Прыпрагу сароку,
Паеду далёка,
У новай кашулі
Да свайго дзядулі.
Дзед дасць піражочак
І сыра кусочак.

**III этап: «Загадка».**

***Настаўнік:***
— Перш чым мы з вамі праявім сваю кемлівасць, пакажам здольнасці, я прапаную паслухаць інфармацыю пра тое, адкуль з'явілася загадка.

***Вучань:***
— Чалавек пачаў ствараць загадкі ў глыбокай старажытнасці. Тады людзі выкарыстоўвалі загадку, каб схаваць свае думкі і намеры, каб зберагчы ад «нячыстай сілы» сваё жытло, сваю сям'ю, жывёлу, прылады працы. Загадка — гэта жанр народнай паэтычнай творчасці, апісанне прадмета або з'явы. З далёкіх часоў людзі загадвалі загадкі маленькім дзяцям. І цяпер практычна ні адзінае дзіцячае свята не абыходзіцца без загадак. Яны сталі элементам забавы.

***Настаўнік:***
— А цяпер для вас загадкі. Адгадайцека, дзеткі! Згодныя? Тады давайце прыступім і пакажам свае здольнасці. Прапаную кожнаму гуляць за сябе.

***Дзед Барадзед:***
— Я таксама ведаю шмат загадак. Хто іх адгадае, атрымае салодкі прыз. А калі ніхто не адгадае, то ўсе прызы застануцца мне.
1. Днём я сплю, ноччу — спяваю,
Усё ў цемры заўважаю.
На мышэй палюю ў полі,
Не сустрэць мяне ніколі. *(Сава.)*
2. Што бяжыць без повада? *(Вада.)*
3. Што нас корміць, а есці не просіць? *(Зямля.)*
4. Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. *(Вясёлка.)*
5. Касматы, вусаты, есці пачынае — песенькі спявае. *(Кот.)*
6. Ходзіць па двары, на нагах — капцюры, белае каменне нясе. *(Курыца.)*

**IV этап: «Лічылка».**

***Дзед Барадзед:***
— Раз, два, тры, чатыры, пяць — я іду вас усіх шукаць! Хто не схаваўся, я не вінаваты.

***Настаўнік:***
— Як вы думаеце, аб чым зараз пойдзе размова?

Для чаго патрэбны лічылкі? *(Лічылкі часта прыдумляюць самі дзеці, і іх вынаходлівасць у гэтым бязмежная. Але часам рыфмаваныя лічылкі складаюць прафесійныя дзіцячыя паэты. Часта выкарыстоўваюцца таксама пацешкі ці вершы, якія з цягам часу становяцца народнымі.*

*Звычайна, прамаўляючы лічылкі, паказваюць на ўдзельнікаў гульні, і на каго выпадзе апошняе слова, той і водзіць.)*

***Дзед Барадзед:***

— Прапануем самыя вясёлыя вершыкі-лічылкі, якія не толькі дапамогуць арганізаваць гульню, але і пацешаць малых.

Хто ведае якія-небудзь лічылкі?

*(Слова даецца прадстаўніку адной з груп.)*

Пятро, Пятро,
Карове піць —
Табе жмурыць.

Кацілася торба
З вялікага горба,
А ў той торбе хлеб, пшаніца,
Хто з кім хоча — з тым дзяліся...

**V этап: «Прыказка і прымаўка».**

***Настаўнік:***

— А ці ведаеце вы, што такое прыказка і прымаўка? *(Адказы дзяцей.)*

Так, прыказка — кароткае народнае выслоўе з павучальным зместам, а прымаўка — кароткае выслоўе, звычайна вобразнае, якое адрозніваецца ад прыказкі тым, што не мае павучальнага зместу.

***Вучань:***

— Прыказкі і прымаўкі складаліся яшчэ ды таго, як з’явілася пісьменнасць. У прымаўках народ перадаваў дзецям і ўнукам правілы жыцця, вучыў іх розуму. Старадаўнія прыказкі жывуць і сёння — у размовах, у кнігах. Прыказкі ўпрыгожваюць наша жыццё, робяць мову жывой і яскравай. Пісьменнікі і паэты часта выкарыстоўваюць трапныя вобразныя выразы ў сваіх творах.

Зараз мы правядзем конкурс на лепшага знаўцу прыказак і прымавак.

***Дзед Барадзед:***

— Усе гатовы? Тады пачынаем.

Прадоўжыце прыказкі і прымаўкі і растлумачце іх сэнс.

Каб рыбу есці... *(трэба ў ваду лезці).*
Загляне сонца... *(і ў наша ваконца).*
Не ў службу... *(а ў дружбу).*
Чалавек без сябра... *(што ежа без солі).*
На вуснах — мёд... *(а на сэрцы— лёд).*
Нічога не знаю — ... *(мая хата з краю).*
Як баба да дзеда, так... *(і дзед да бабы).*

**VI этап: «Вітанне і пажаданне».**

***Настаўнік:***

— Успомніце, з чаго пачынаецца ваш дзень? *(Адказы дзяцей.)*

Паспрабуем паказаць, як гэта павінна быць, у наступнай гульні.

Гульня **«Разбудзі дзіця».**

Вучні стаяць з заплюшчанымі вачыма ля сваіх парт. Вучань, што стаіць за першай партай, па камандзе настаўніка расплюшчвае вочы. Ён мімічна або як мага цішэй жэстам выконвае паказаную настаўнікам каманду. Затым паварочваецца да вучня, што стаіць за ім, «будзіць» яго, перадае каманду і садзіцца на сваё месца. Наступны вучань выконвае тое ж самае, пакуль заданне не выканаюць усе вучні класа. Галоўная ўмова гэтай гульні — дакладнасць, акуратнасць і хуткасць пры захаванні максімальнай цішыні.

***Дзед Барадзед:***

— А ці ведаеце вы, як вітаюць адзін аднаго людзі ў розных краінах?

*(Настаўнік дае слова прадстаўніку адной з груп.)*

1. Рускія, англічане, амерыканцы ў якасці вітальнага жэсту паціскаюць адзін аднаму рукі. Гэта называецца «поціск рукі».
2. У Тыбеце традыцыйнае прывітанне — гэта высоўванне языка, якім дэманструецца адсутнасць злога намеру. Рытуал часта дапаўняецца скрыжаваннем далоняў на грудзях.
3. Прадстаўнікі некаторых плямёнаў Новай Зеландыі пры сустрэчы дакранаюцца адзін да аднаго насамі.

4. У Японіі прынята рабіць паклон. Чым даўжэй і ніжэй паклон, тым больш павагі вы праяўляеце.
5. Кітайцы і карэйцы таксама традыцыйна кланяюцца.
6. У Індыі ў знак прывітання складаюць рукі разам і прыціскаюць іх да грудзей.
7. У Замбезіі — пляскаюць у далоні і прысядаюць.
8. Эскімосы моцна ўдараюць адзін аднаго кулаком па галаве і па спіне. Робяць гэта толькі мужчыны.

***Дзед Барадзед:***

— Колькі цікавага і незвычайнага я сёння пачуў!

Вы толькі што пра многае даведаліся аб правілах прывітання ў розных народаў. А цяпер паглядзім, ці ведаеце вы, як вітаюць адзін аднаго беларусы? *(Адказы вучняў: Дзень добры! Добры дзень вам! Дзень добры ў хату! Добрага дня! Добрага ранку! Здравенькія былі!)*

— А якія выказваюць пажаданні? *(Адказы вучняў: Усяго добрага! Усяго найлепшага! Каб вам вялося! Спорна вам!)*

***Настаўнік:***

— Прапаную пагуляць у гульню **«Давайце павітаемся»**.

Дзеці хаатычна рухаюцца па пакоі і па сігнале настаўніка (пляскае ў далоні) вітаюцца з усімі, хто сустракаецца на іх шляху (магчыма, што хто-небудзь з дзяцей будзе спецыяльна імкнуцца павітацца менавіта з тым, хто звычайна не звяртае на яго ўвагі). Вітацца трэба пэўным чынам:

адно плясканне — вітаемся за руку;

два пляскання — вітаемся плечукамі;

тры пляскання — вітаемся спінкамі.

*(Для паўнаты тактыльных адчуванняў пажадана ўвесці забарону на размовы.)*

***Настаўнік:***

— Наступная гульня называецца **«Аўкцыён прывітанняў»**.

***1-ы тур.*** Назваць усе прывітанні, якімі мы карыстаемся ў паўсядзённым жыцці. *(Добры дзень, прывітанне, добрага дня...)*

***2-і тур.*** Успомніць і паказаць знаёмыя жэставыя прывітанні. *(Поціск рукі, ківок галавой, пацалунак рукі, здыманне галаўнога ўбору...)*

***Настаўнік:***

— У завяршэнне класнай гадзіны я прапаную вам згуляць яшчэ ў адну гульню.

Камунікатыўная гульня **«Пажаданне на дзень»**.

*(Вучні садзяцца ў круг, у настаўніка ў руках мяч.)*

***Настаўнік:***

— Пачнем нашу гульню з выказвання адзін аднаму пажадання на сённяшні дзень. Яно павінна быць кароткім, у адно слова. Вы кідаеце мяч таму, каму хочаце нешта пажадаць, і адначасова называеце слова. Той, каму кінулі мяч, кідае яго наступнаму вучню, выказваючы і яму пажаданне на сённяшні дзень.

## VII этап: «Пазітыўны вынік».

***Настаўнік:***

— Дзеці, вазьміце алоўкі і намалюйце чалавечка ў добрым настроі. Хочацца верыць, што вы будзеце больш дабрыя і ўважлівыя адзін да аднаго, і запомніце правіла: калі вы хочаце, каб да вас звярталіся ветліва, то рабіце гэта ветліва самі.

Дзякуй за ўвагу!

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 04.03.2019.*

# К. Д. Ушинский о личности учителя и системе его подготовки

**Ф. В. Кадол,**
заведующий кафедрой педагогики
Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, профессор, доктор педагогических наук

Учитель живёт до тех пор, пока он учится.
Как только он перестаёт учиться, в нём умирает учитель.
*К. Д. Ушинский*



**К 195-летию выдающегося педагога**

Константина Дмитриевича Ушинского (1824—1871) по праву считают основоположником российской педагогической науки, которая оказала самое плодотворное влияние на учителей и учёных-педагогов советского и постсоветского педагогического пространства. Научно-педагогическое наследие выдающегося учёного по сей день остаётся актуальным для учителей и педагогов-исследователей всего мира. Его единомышленник и современник Л. Н. Модзалевский утверждал: «Ушинский — это наш действительно народный педагог, точно так же, как Ломоносов — наш первый народный учёный, Суворов — наш народный полководец, Пушкин — народный поэт, Глинка — наш народный композитор» [1, с. 24]. И действительно, одним из принципов педагогического мировоззрения К. Д. Ушинского был принцип народности обучения и воспитания.

Родился К. Д. Ушинский 19 февраля (2 марта) 1823 года в городе Тула в семье отставного офицера, участника Отечественной войны 1812 года. Первоначальное образование получил в семье под руководством матери, Любови Степановны, которая поддерживала и развивала любознательность ребёнка, его пытливую мысль. Важно отметить, что впоследствии выдающийся педагог неоднократно подчёркивал: от нравственности женщины преимущественно зависит состояние нравственности семей

и общества в целом. Мать во всех классах и слоях общества оказывает несравненно большее воздействие на духовно-нравственное воспитание детей и молодёжи, чем отец. Воспитательные наставления, как и материнские понятия о добре и зле, склонности к добродетели или пороку глубоко врезаются в детскую память. К. Д. Ушинский констатировал, что в странах, где нравственность женщин испорчена, общество также заражается порочным поведением и семейные союзы распадаются. Данные педагогические воззрения весьма актуальны и для современного социума, испытывающего потребность в повышении нравственности общественного и семейного воспитания.

Будучи весьма одарённым мальчиком, в 11 лет Константин Ушинский начал обучение в третьем классе Новгород-Северской гимназии, а по окончании её поступил на юридический факультет Московского университета. В 1846 году выпускник Ушинский был назначен исполняющим обязанности профессора «камеральных наук» (экономики и финансов) Ярославского Демидовского юридического лицея. Лекции будущего классика мировой педагогики были содержательными и интересными, он быстро завоевал авторитет у студентов.

С марта по май 1848 года К. Д. Ушинский редактировал неофициальную часть газеты «Ярославские губернские ведомости» и пропагандировал естественнонаучные и исторические знания. Эту деятельность можно считать его первыми литературными пробами, которые уже тогда имели педагогическую направленность. Период жизни в Ярославле имел для К. Д. Ушинского большое значение: именно тогда происходил процесс овладения преподавательским мастерством, шло формирование научных педагогических взглядов.

В 1849 году он переехал в Петербург и с 1855 года преподавал словесность и географию в Гатчинском сиротском институте. В стенах этого учебного заведения находился архив одного из прежних инспекторов — Е. О. Гугеля, где К. Д. Ушинский обнаружил большую педагогическую библиотеку. Найденные книги оказали огромное влияние на его профессиональное самообразование. Результатом их глубокого изучения явилась публикация одной из лучших статей научно-педагогического содержания — «О пользе педагогической литературы». Ушинский стал постоянным автором «Журнала для воспитания».

В 1859 году его пригласили на должность инспектора классов Смольного института благородных девиц. Здесь выдающемуся педагогу удалось провести значительные, как сейчас бы сказали, инновационные перестройки. Исходя из своего главного принципа — демократизации народного образования и народности воспитания — К. Д. Ушинский упразднил существовавшее ранее разделение учащихся на «благородных» и «неблагородных» (то есть из дворянского и мещанского сословий). Им была введена практика преподавания учебных предметов на русском языке, открыт специальный класс, в котором осуществлялась подготовка обучающихся в институте девушек к профессии воспитательницы. Кроме того, воспитанницы получили право проводить каникулы и праздники у родителей в домашней обстановке.

Новаторская деятельность Ушинского в Смольном институте вызвала недовольство официальных властей, и в 1862 году его освободили от занимаемой должности как нежелательного для молодёжи наставника. Уже известному к тому времени педагогу была предложена заграничная командировка для изучения женского образования в странах Европы.

В дальнейшем выдающийся учёный занимался литературно-педагогической деятельностью. Он писал: «Сделать как можно больше пользы моему отечеству — вот единственная цель моей жизни, и к ней-то я должен направлять все свои способности» [2, с. 47]. Педагогические идеи Ушинского отражены в книгах для начального обучения «Детский мир» (1861) и «Родное слово» (1864), фундаментальном научном труде «Человек как предмет вос-

К. Д. Ушинский рассматривал личность учителя как центральное звено целостного образовательного процесса и как ведущий фактор нравственного развития обучающихся, подчёркивая: «В воспитании всё должно основываться на личности воспитателя, потому что воспитательная сила изливается только из живого источника человеческой личности. Никакие уставы и программы, никакой искусственный организм заведения, как бы хитро он ни был придуман, не может заменить личности в деле воспитания. Только личность может действовать на развитие и определение личности, только характером можно образовать характер»

питания. Опыт педагогической антропологии» и в многочисленных работах глубоко научного и практико-ориентированного содержания. Многие педагогические материалы отражали опыт воспитания детей в его собственной семье, где было шестеро детей. В этой своеобразной педагогической «лаборатории» шла апробация детских рассказов и сказок, грамматических и математических упражнений, помещённых на страницах книг К. Д. Ушинского для начальной школы.

К сожалению, не всё задуманное выдающимся учёным осуществилось. 22 декабря 1870 года (3 января 1871) по дороге в Крым К. Д. Ушинский простудился и остановился для лечения в Одессе, где и скончался. Российские современники чтят память великого русского педагога: ежегодно проводятся педагогические чтения, изданы полное и избранные собрания его сочинений. Имя Ушинского носят улицы в Ярославле, Киеве и Санкт-Петербурге. Ярославский государственный педагогический университет и Российская педагогическая библиотека в Москве названы в честь педагога-новатора.

Вся его жизнь и профессиональная деятельность были посвящены проблемам и потребностям общественного развития России того времени, проникнуты осознанием необходимости преобразования её системы образования. К. Д. Ушинский рассматривал личность учителя как центральное звено целостного образовательного процесса и как ведущий фактор нравственного развития обучающихся, подчёркивая: «В воспитании всё должно основываться на личности воспитателя, потому что воспитательная сила изливается только из живого источника человеческой личности. Никакие уставы и программы, никакой искусственный организм заведения, как бы хитро он ни был придуман, не может заменить личности в деле воспитания. Только личность может действовать на развитие и определение личности, только характером можно образовать характер» [2, с. 191]. Лишь нравственные убеждения учителя могут перейти в свойства личности и черты характера воспитанников, их мировоззрение и культуру поведения.

К. Д. Ушинский стремился поднять авторитет педагогической профессии, показать её высокую общественную значимость. По его мнению, «воспитатель, стоящий в уровне с современным ходом воспитания, чувствует себя посредником между всем, что было благородного и высокого в прошедшей истории людей, и поколением новым, хранителем святых заветов людей, боровшихся за истину и за благо» [2, с. 165]. Размышляя о роли педагога, его основополагающих личностных качествах, Ушинский утверждал, что учитель является в обществе и государстве человеком, который сформировался в народной среде, познал все сложности воспитательного процесса. В педагогике не может быть универсальных методов обучения и воспитания. Личность растущего человека формируется главным воспитателем — жизнью, со всеми её обстоятельствами и случайностями. Поэтому каждый учитель должен быть всесторонне образованным, способным и готовым к постоянному рас-

ширению своего научного профессионального и практического кругозора. Великий педагог рекомендовал искать способы обучения и воспитания, направленные на личностное самосовершенствование, то есть учителю необходимо владеть педагогической рефлексией и регулярно осуществлять беспристрастный и критический анализ результатов своей работы, видеть негативные поступки, недостатки не только учеников, но и собственные. Педагог достигает вершины профессионального мастерства в том случае, если доносит воспитуемым истинную сущность нравственных убеждений, если сам поступает честно и по совести. Исключительно нравственных знаний и общей образованности, насколько совершенными они бы ни были, творчески работающему учителю недостаточно.

Важную роль в психологической структуре личности учителя К. Д. Ушинский отводил педагогическому такту, который, по его убеждению, должен быть главной характеристикой профессионализма учителя. Но в то же время «педагогический такт есть только приложение такта психологического, его специальное развитие в области педагогических понятий» [3, с. 31]. Учёный особо подчёркивал: ни один учитель не станет хорошим воспитателем-практиком без педагогического такта. В его развитии велика роль психологических знаний, жизненного и педагогического опыта учителя. При этом важно, чтобы применяемые методы и средства соответствовали личностно-возрастным и индивидуальным особенностям обучающихся.

Выдающийся педагог отмечал, что в профессиональной деятельности учителей знание о психологической стороне нравственного развития и саморазвития личности необходимо в такой же степени, как для специалистов в области медицины изучение анатомии и физиологии человека. Каждый, кто занимается духовно-нравственным воспитанием детей и учащейся молодёжи, должен как можно лучше знать психологию личностного развития обучающихся — главный предмет своей профессиональной деятельности.

По убеждению основоположника российской педагогики, работа учителя как наставника и воспитателя требует постоянного внутреннего его воодушевления. Её результаты замечаются не сразу и носят отсроченный характер. Только находясь на одном уровне с внутренним ходом воспитания и обучения подрастающих поколений, учитель ощущает себя деятельным участником целостного образовательного процесса, звеном между прошлым и будущим.

К. Д. Ушинский видел и критиковал вопиющие недостатки в научной и практической подготовке педагогов. В статье «Проект учительской семинарии» была представлена разработанная им система подготовки учителей для сельских народных школ. Он также предлагал создавать в университетах педагогические факультеты, где получали бы образование будущие преподаватели педагогики и учителя средней школы. В целях повышения квалификации народных учителей считал необходимым организовывать при семинариях высшие педагогические курсы, ежегодное чтение лекций по педагогике и психологии; высоко оценивал зна-

В профессиональной деятельности учителей знание о психологической стороне нравственного развития и саморазвития личности необходимо в такой же степени, как для специалистов в области медицины изучение анатомии и физиологии человека. Каждый, кто занимается духовно-нравственным воспитанием детей и учащейся молодёжи, должен как можно лучше знать психологию личностного развития обучающихся — главный предмет своей профессиональной деятельности.

чение учительских съездов и конференций.

В семинарии советовал принимать только тех, у кого есть природные задатки и очевидные способности стать хорошим учителем. Предварительный отбор и подготовка к получению образования в этих заведениях включают обучение в течение нескольких лет в подготовительной учительской школе, последующую сдачу экзамена и зачисление, которое осуществляет учёный совет семинарии отдельно по каждому поступающему. В семинарии наряду с изучением преподавания в школе учебных предметов происходит основательная практическая подготовка будущих народных учителей. Они должны в совершенстве владеть грамотным и каллиграфическим письмом, уметь рисовать, выразительно читать и хорошо петь, считал Ушинский. Кроме общих и специальных предметов, обязательным для семинаристов является также курс естественных наук. Важно, чтобы народный учитель умел советом и делом оказать нужную агрономическую и медицинскую помощь ученикам и их родителям. Свои суждения о необходимости предоставления педагогического образования женщинам педагог-новатор воплотил в жизнь, работая в Смольном институте. Он открыл для его воспитанниц педагогический класс, где готовили учителей народных школ.

Учёный всегда характеризовал личность учителя как решающее звено в системе нравственного развития и саморазвития обучающихся. Задача воспитания и обучения, по его словам, — не только развить разум человека и дать ему известный объём сведений, но и зажечь в нём жажду серьёзного труда, без которого жизнь не может быть ни достойной, ни счастливой.

Не обошёл вниманием К. Д. Ушинский и такую актуальную проблему, как учебная перегрузка обучающихся, сложность учебных программ и разработанных на их основе учебников. Он выступал за оптимально необходимое определение объёма научных знаний и соответствующих учебных дисциплин, изучаемых в учреждениях образования.

Педагогическое наследие учёного позволяет не только осознать значение роли учителя в жизни современных детей и учащейся молодёжи, но и рассмотреть пути влияния психолого-педагогической науки на его воспитательную деятельность и личностное становление.

Все помыслы К. Д. Ушинского были проникнуты глубоким уважением и искренней любовью к благородному труду педагога и его личности. Он всегда подчёркивал её общественное значение, определил главные качества, необходимые для плодотворной деятельности учителя, выработал специальную систему его научной и педагогической подготовки.

